ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 70 (2123)
30 жніўня 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАПЯРЭДАДНІ

1 верасня... Святочны, радасны дзень. Паслязаўтра школы запоўніць жыццярадасная гаманкая дзятва. Зальецца трэллю першы званок, пакліча вучняў на ўрокі.

Тысячы і тысячы юнакоў і дзяўчат прыйдуць у гэты дзень і ў аўдыторыі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў. Сярод іх — новае папаўненне.

Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» звярнуўся напярэдадні новага навучальнага года да некаторых кіраўнікоў спецыяльных вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў з просьбай расказаць аб новым папаўненні, аб зменах, якія адбыліся з мінулага года.

В. А. ЗАХАРАЎ,
рэктар Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута

Па-першае, хачу сказаць, што конкурс сёлета ў нас быў надзвычай вялікі, асабліва на акцёрскі факультэт. Гэта і добра — камісія мела магчымасць адабраць найбольш здольных юнакоў і дзяўчат.

У гэтым годзе ў наш інстытут прыйшлі пераважна выпускнікі сярэдніх школ. Адметна і тое, што значна павялічыўся прыток моладзі з раёнаў, вёсак нашай рэспублікі. Скажам, на акцёрскі факультэт прынята 10 дзяцей калгаснікаў. Шмат першакурснікаў з раёнаў і на мастацкім факультэце.

У гэтым годзе набор студэнтаў на ўсе факультэты ў нас значна павялічыўся. Так, калі летась на акцёрскі факультэт было прынята 25 чалавек, дык сёлета 42, у тым ліку чацвёра будуць авалодваць рэжысурай (летась такога набору не было). Упершыню сёлета пачнуцца заняткі на вячэрнім аддзяленні прамысловага мастацтва, на якое залічана 10 чалавек. Гэта інжынеры, тэхнікі, мастакі-канструктары—людзі, якія непасрэдна займаюцца эстэтыкай на вытворчасці. На першым курсе дзённага аддзялення прамысловага мастацтва ў нас будзе займацца 15 чалавек. Гэта ўжо другі набор. Аддзяленне новае, цікавае. Але шкада, што студэнты яго, якія павінны займацца больш за ўсё практычна, не маюць для гэтага спрыяльных умоў—няма лабараторый. Намечанае ж будаўніцтва новага корпуса ўсё замаруджваецца. Таму і працаваць над вучэбнымі заданнямі па інтэр'еру, мадэліраванню нашым студэнтам таксама даводзіца ў вельмі цяжкіх умовах.

І. Д. БЕЛАГОРЦАЎ,
рэктар Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута

Наш інстытут, 28-я па ліку вышэйшая навучальная ўстанова ў рэспубліцы, сёлета ўпершыню расчыняе дзверы. На першы курс залічана чатырыста чалавек, у тым ліку сто на вячэрняе аддзяленне. Гэта будучыя архітэктары, інжынеры прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва, сельскагаспадарчага будаўніцтва, інжынеры гарадскога (камунальнага) будаўніцтва, інжынеры-тэхнолагі па ачыстцы прыродных і сцёкавых вод. Ва ўсіх гэтых спецыялістах у нас у рэспубліцы ёсць пільная патрэба.

Адна з вядучых спецыяльнасцей нашага інстытута — архітэктура. Здольныя, удумлівыя дойліды ўсё больш і больш патрэбны сёння як гораду, так і вёсцы. На першы курс архітэктурнага факультэта паступіла 50 чалавек. У асноўным гэта выпускнікі сярэдніх школ. Прынята некалькі чалавек з тэхнікумаў. А Юрыя Рудых накіраваў на вучобу з Пінска «Міжкалгасбуд». У пераважнай большасці паступіўшыя атрымалі выдатныя адзнакі па малюнку.

Весці заняткі ў інстытуце будуць 32 выкладчыкі, сярод якіх 12 кандыдатаў навук. Яны прыехалі ў Брэст з розных куткоў рэспублікі, краіны. Так, з Мінска да нас прыехаў кандыдат архітэктуры Анатоль Якаўлевіч Лісянін, з Новасібірска — кандыдат архітэктуры Мікалай Васільевіч Бялоў.

Цудоўныя карпусы інстытута і інтэрната на 632 месцы падаравалі будаўнікі сваім будучым калегам. У пяціпавярховым будынку — 160 аўдыторый і лабараторый. Рацыянальна размясціліся лабараторыі згодна з праектам Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР.

Ул. Ул. АЛОЎНІКАЎ,
рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі

Спачатку хачу сказаць, што сёлета набор у кансерваторыю значна павялічыўся. Калі ў мінулым годзе на першы курс дзённага аддзялення па ўсіх спецыяльнасцях было прынята 95 чалавек, дык сёлета — 135. З іх 128 скончылі беларускія сярэднія музычныя навучальныя ўстановы.

Значны прыток студэнтаў-першакурснікаў быў не толькі з Мінскага музычнага вучылішча, а і з Маладзечанскага, Віцебскага, Магілёўскага, Брэсцкага, Гродзенскага вучылішчаў. Іх выхаванцы паказалі на экзаменах добрае выканаўчае майстэрства. Сярод вакалістаў на мяне асабіста прыемнае ўражанне зрабіў бас М. Зданевіч і сапрана В. Райз. Думаю, з іх атрымаюцца здольныя спевакі.

Сёлета пры кансерваторыі ўпершыню адкрыта падрыхтоўчае кампазітарскае аддзяленне. На яго залічаны Віктар Войцік і Леанід Захлеўны з Гродзенскага музычна-педагагічнага вучылішча і выпускнікі мінскіх сярэдніх школ Тамара Лысенка і Алег Сонін.

Сёлета адноўлена ў нас і аддзяленне оперна-сімфанічнага дырыжыравання.

Е. М. МУРАШОВА,
намеснік дырэктара па навучальнай частцы Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума

Летась наш тэхнікум набіраў навучэнцаў толькі з сямігадовай і васьмігадовай адукацыяй. Сёлета ж упершыню адбыўся набор выпускнікоў сярэдніх школ. З васьмі груп дзённага аддзялення — пяць з выпускнікоў сярэдніх школ. Тое ж самае назіраецца і на завочным аддзяленні.

Вядома, што складзены новыя планы, праграмы навучання студэнтаў. Так, завочнікі з гэтага года, як і на стацыянары, будуць вывучаць «Асновы навуковага атэізму». На дзённым аддзяленні ўведзены такія новыя прадметы, як «Асновы марксісцка-ленінскай эстэтыкі», «Тэхнічныя сродкі культработы ў бібліятэках».

Хацелася б падзяліцца і другой радаснай навіной напярэдадні новага навучальнага года, але... Да 1 верасня наш тэхнікум павінен быў перасяліцца ў новы прасторны будынак. Але падвялі будаўнікі — не скончылі аддзелачных работ. Давядзецца месяц-другі пачакаць, займацца па-ранейшаму ў дзве змены.

І. Б. МЫСЛІЎЧЫК,
дырэктар Мінскага музычнага вучылішча імя Глінкі

Наш выкладчыцкі калектыў сёлета папоўніўся. Працаваць у вучылішча прыйшлі выпускнікі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Г. Карасік, Л. Пушкіна, І. Бяседа, Ж. Бастракова і іншыя.

1 верасня яны пачнуць заняткі са сваімі выхаванцамі. Трэба сказаць, што выхаванцаў у нас сёлета — як ні адзін год. Меркавалася на дзённае аддзяленне спачатку прыняць 83 чалавекі, а прынялі 110. Павялічыўся прыём па класах фартэпіяна, дырыжыравання, народных, духавых і ўдарных інструментаў.

У вучылішчы будзе займацца таксама 25 вячэрнікаў і 69 завочнікаў. Прычым для навучэнцаў завочнага аддзялення складзены новыя планы, скарочаны тэрмін навучання.



Распрацаваны расклад заняткаў у Мінскім музычным вучылішчы імя Глінкі. Перад тым, як вывесіць яго на дошку аб'яў, загадчык навучальнай часткі вучылішча А. Дзмітрыеў і загадчык вячэрняга і завочнага аддзялення Э. Безбярд удакладняюць асобныя моманты.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

НА РУБЯЖАХ ПЯЦІГОДКІ

ЯШЧЭ АДЗІН ЗАВОД



СЁННЯ ў рэспубліцы гэта звычайная з'ява: там, дзе ўчора было чыстае поле, цяпер узвышаюцца заводскія карпусы, праляглі кварталы жылых дамоў.

Будаўнічая пляцоўка, якую вы бачыце на здымку ўнізе, раскінулася ля Гродзенскага азотнатукавага завода. Тут узводзіцца яшчэ адно прадпрыемства вялікай хіміі. Яно будзе выпускаць капралактам—хімічны прадукт для заводаў штучнага валакна і пластмасавых вырабаў і ўгнаенні.

Будаўнікі спяшаюцца. Работы вядуцца адначасова на дваццаці аб'ектах. На ўсіх участках будаўніцтва ідзе з апераджэннем графіка. Асабліва добра працуе на новабудоўлі моладзь. Камсамолец Аляксандр Латкін (здымак справа) — адзін з лепшых мантажнікаў. Штодзень ён са сваімі таварышамі перавыконвае нормы.

У канцы будучага года завод дасць першую прадукцыю.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ (БЕЛТА).

ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР прысвоена ганаровае званне заслужаных настаўнікаў БССР групе работнікаў савецкай школы. Гэтага высокага звання ўдастоены і два мастакі, якія многа ўвагі і энергіі аддаюць эстэтычнаму выхаванню падрастаючага пакалення: Сяргей Пятровіч Каткой і Віктар Іванавіч Вярсоцкі. Абодва шмат год выкладалі ў школе, у мастацкім вучылішчы, кіруюць на працягу доўгага часу студыямі выяўленчага мастацтва: С. Каткой — у Палацы піянераў, а В. Вярсоцкі — у 75-й школе г. Мінска.

САРДЭЧНЫЯ СУСТРЭЧЫ

САРДЭЧНА, па-брацку сустракала сталіца Савецкай Беларусі дарагіх гасцей—Першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі, Старшыню Дзяржаўнага савета ГДР таварыша Вальтэра Ульбрыхта з жонкай, яго спадарожнікаў, якія наведалі Мінск з дружалюбным візітам.

Працоўныя беларускай сталіцы віталі Вальтэра Ульбрыхта як шчырага і адданага сябра Савецкага Саюза, як нястомнага змагара за мір і сацыялізм, за адзінства міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, за ўмацаванне садружнасці краін сацыялізма, братняй дружбы паміж савецкім і нямецкім народамі.

«Сардэчна запрашаем, дарагія нямецкія сябры!» — такімі словамі сустракалі жаданых гасцей, дзе б яны ні пабывалі. Плошчы, вуліцы беларускай сталіцы былі ўпрыгожаны дзяржаўнымі флагамі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Савецкага Саюза і Беларускай ССР. На чырвоных палотнішчах транспарантаў, якія працягнуліся праз вуліцы,—словы прывітання на нямецкай, рускай, беларускай мовах.

У нядзелю з раніцы Вальтэр Ульбрыхт і яго спадарожнікі пачалі знаёміцца з Мінскам. У паездцы па гораду гасцей суправаджаў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў.

Вальтэр Ульбрыхт і яго спадарожнікі агледзелі цэнтральную магістраль горада — Ленінскі праспект, жылы мікрараён ў паўночна-ўсходняй частцы Мінска, плошчу імя Леніна, наведалі дзіцячую чыгунку.

Затым госці з ГДР пабывалі ў Палацы спорту, на Заслаўскім вадасховішчы — любімым месцы адпачынку мінчан.

Пасля вяртання ў горад адбылася гутарка кіраўнікоў Камуністычнай партыі і ўрада Беларусі з Вальтэрам Ульбрыхтам.

У другой палавіне дня Вальтэр Ульбрыхт ускладаў вянок да манумента Перамогі.

З вялікай цікавасцю сябры з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі агледзелі экспазіцыю Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Вечарам у зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбыўся канцэрт у гонар гасцей. Нямецкіх сяброў горача віталі сотні мінчан, якія прысутнічалі ў канцэртнай зале.

Учора раніцою Вальтэр Ульбрыхт наведаў маторны завод. З ім на прадпрыемства прыбылі П. М Машэраў, Ф. А. Сурганаў, Д. Ф. Філімонаў, М. І. Лагір, Л. Г. Кляцкоў, В. Я. Лежапёкаў. Нямецкія госці пазнаёміліся з жыццём завода, пабывалі ў цэхах, лабараторыях, гутарылі з рабочымі, інжынерна-тэхнічнымі работнікамі. У абедзенны перапынак на плошчы перад заводакіраўніцтвам адбыўся вялікі мітынг германа-савецкай дружбы. Цёпла сустрэлі прысутныя выступленне Вальтэра Ульбрыхта. Мітынг выліўся ў яркую дэманстрацыю германа-савецкай дружбы.

ПРЫСВЕЧАНА ГЕРОЯМ

На цэнтральнай сядзібе сельскагаспадарчай арцелі «Маяк камунізма», што на Барысаўшчыне, стаіць высокі помнік-абеліск у памяць аднавяскоўцаў, якія аддалі жыццё ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З усіх чатырох бакоў на мармуры высечаны прозвішчы 140 франтавікоў і партызан, якія не вярнуліся з поля бою ў свае родныя вёскі. Ля падножжа помніка, нібы вечны агонь, цвітуць яркія чырвоныя кветкі, ляжаць вянкі з надпісамі: «Ад бацькоў», «Ад родных і блізкіх», «Ад дзяцей і ўнукаў», «Ад юных краязнаўцаў».

У раённым Доме культуры, які знаходзіцца на тэрыторыі калгаса, абсталяваны шматлікія стэнды і фотавыстаўкі, прысвечаныя баявым подзвігам.

Адзін са стэндаў называецца «Слава героям Вялікай Айчыннай, слава героям працы». Ён расказвае пра гераічныя справы былых франтавікоў і партызан, якія сёння працуюць у калгасе. Сярод іх—работнік жывёлагадоўчай фермы, кавалер трох ордэнаў Славы І. Панамар, трактарыст М. Цітавец, калгаснікі А. Цімафееў, А. Паповіч і іншыя.

Працоўным подзвігам Валянціна Іванавіча Дразда прысвечаны спецыяльны плакат, дзе гаворыцца, што камплексная брыгада, якою кіруе былы воін, у спаборніцтве за высокія ўраджаі збожжавых культур займае ў раёне адно з першых месц.

Мясцовы Дом культуры і праўленне калгаса часта праводзяць тэматычныя вечары, якія прысвячаюцца баявым і працоўным справам землякоў.

В. ПЯТРОУСКІ.

ПУСЦІЦЕ АРХІТЭКТУРУ Ў ВЁСКУ!

Аляксандр ТАФ,
Алег СУРСКІ

Нядаўна аднаму з нас давялося пабываць у калгасе «Перамога» Браслаўскага раёна. Калгас гэты паспяхова развіваецца, будуецца. На новыя, добрыя дамы калгаснікаў і гаспадарчыя будынкі выдаткуецца нямала сродкаў і працы. Але робіцца ўсё гэта бессістэмна, непрадумана. Ніхто не клапоціцца пра эстэтычнае аблічча вёскі.

Упрыгожаннем пасёлка, напрыклад, з'яўляецца маляўнічае возера Мілашкі. Здавалася б, цяжка знайсці лепшае месца для стварэння грамадскага і культурнага цэнтра калгаса і зоны адпачынку. Замест гэтага на беразе возера пабудавалі... кароўнік.

Прыклад гэты не адзіны. У суседнім калгасе «Іскра» забрудзілі рэчку Драсятку, пабудаваўшы на яе беразе свінарнік.

У тым жа Браслаўскім раёне ёсць прыгожы стары парк, багаты каштоўнымі пародамі дрэў. Але вось прыйшлі будаўнікі і пачалі на яго тэрыторыі капаць катлаван, агаляючы карэнне векавых ліп і дубоў. Некалькі гадоў назад тут размясцілася раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі з вялікай гаспадаркай і нафтабазай, вакол якой гінуць дрэвы, кусты, трава. Парк засмечаны, адпачываць у ім нельга.

Проста дзіву даешся, наколькі глухія да прыгажосці некаторыя гаспадарнікі. У калгасе «Перамога» (усё той жа Браслаўскі раён) вакол яшчэ аднаго унікума прыроды — своеасаблівага букета з васьмі векавых ліп, якія зрасліся ў адно гіганцкае дрэва,—зрабілі... выгульную пляцоўку для свіней.

Могуць запярэчыць — падумаеш, дрэва. Навокал жа цэлыя лясы!

Але дабіраюцца і да лясоў, рэк, азёр...

Усім вядома важнасць меліярацыйных мерапрыемстваў, што праводзяцца зараз у рэспубліцы. Аднак нярэдка ў выніку некомплекснага вядзення работ, непрадуманых, не абгрунтаваных навуковымі разлікамі, суб'ектыўных рашэнняў разам з балотамі асушаюць... рэкі, сажалкі, азёры. За апошнія гады ў Беларусі прыйшлі ў заняпад амаль два дзесяткі некалі мнагаводных рэк. Высахлі Волма, Балачанка, Лоша ў Мінскай вобласці, Эса—у Віцебскай і іншыя, якія ўпрыгожвалі размешчаныя на іх берагах вёскі, жывілі вільгаццю лясы, служылі вадапоем для жывёлы. Толькі ў адным Баранавіцкім раёне знішчана больш як 50 сажалак і азёр.

Ці трэба даказваць, колькі паэзіі, не гаворачы аб элементарных выгодах, даюць насельніцтву вадаёмы, паркі, лясы! Чаму ж так неахайна і безгаспадарча адносімся мы да свайго лепшага сябра — прыроды? Чаму замест таго, каб у працэсе будаўніцтва ўзбагачаць прыроду, мы яе губім?

Адкуль гэта ўсё ідзе? Прычын шмат. Паспрабуем разабрацца хоць бы ў некаторых.

Сучаснае сельскае будаўніцтва пры тым размаху, які яно атрымлівае, нельга весці без навукова абгрунтаваных комплексных схем раённых планіровак, якія б служылі асновай для канкрэтных праектаў пасёлкаў, нарэшце, без кваліфікаванага аўтарскага нагляду за ажыццяўленнем праектаў на месцах. Мінуў той час, калі сякера ды кемлівасць вясковага цесляра аб'ядноўвалі і тэорыю і практыку сельскай архітэктуры, калі мы рады былі проста страсе над галавой у нашых разбураных вайною вёсках. Сёння мы сталі багацейшыя, маем магутную будаўнічую тэхніку, новыя прагрэсіўныя матэрыялы, вопыт сучаснага будаўніцтва...

Бяда, аднак, у тым, што за праблемы архітэктурнага аблічча вёскі мы яшчэ па-сапраўднаму не ўзяліся. Сельскім праектаваннем амаль не займаюцца высокакваліфікаваныя архітэктары. У рэспубліканскім інстытуце «Белгіпрасельбудзе» працуе толькі 20 архітэктараў з вышэйшай адукацыяй пры агульнай колькасці работнікаў у некалькі сот чалавек. Інстытут не мае сваіх філіялаў на месцах, не можа спадзявацца на раённых архітэктараў, бо іх пасады займаюць людзі без архітэктурных ведаў. У рэспубліцы ні ў адным сельскім раёне няма архітэктара са спецыяльнай адукацыяй.

Да сельскай архітэктуры ўвогуле склаліся адносіны як да нечага нязначнага, другараднага. Якое глыбокае самаашуканства! Праектаваннем вёсак не пагарджалі самыя вялікія дойліды. Нагадаем план разбіўкі вёскі Глазава, выкананы Росі. Цудоўныя ўзоры сядзібнага будаўніцтва пакінулі нам В. Бажэнаў, які будаваў Пятроўскае-Алябіна і Паліванава, Н. Казакоў, па праекту якога забудоўвалася Царыцына, П. Жылярдзі, які праектаваў падмаскоўныя Кузьмінкі...

Пералік гэты можна прадоўжыць, прывёўшы прыклады ўдала распрацаваных беларускіх маёнткаў і вёсак з паркамі, сажалкамі, архітэктурай малых форм.

Сутнасць, аднак, не ў колькасці імён і назваў, а ў самім падыходзе да справы. Калі які-небудзь памешчык у мінулым мог дазволіць сабе запрасіць архітэктара, дык ці да твару нашым саўгасам і калгасам задавальняцца самадзейнымі метадамі будаўніцтва!

Сучаснай вёсцы патрэбны вопытныя дойліды, спецыялісты па ландшафтнай архітэктуры, якія ведаюць яе спецыфіку і ўмеюць творча вырашаць сучасныя задачы сельскага будаўніцтва. Наколькі гэта важна, сведчаць нешматлікія эксперыментальныя праекты паказальных пасёлкаў, распрацоўка якіх вядзецца архітэктарамі. Такія праекты ўжо існуюць на Украіне, у Прыбалтыцы, Маскоўскай, Ленінградскай, Растоўскай і іншых абласцях.

Пачалі прыцягваць архітэктараў да праектавання вёсак і ў Беларусі. Аднак з якой цяжкасцю даводзіцца аўтарам такіх праектаў ламаць устаноўленыя традыцыі, даказваць неспецыялістам самыя відавочныя рэчы.

Для прыкладу можна спаслацца на генеральны план узорнага пасёлка саўгаса «Чырвоная зорка» Мінскай вобласці. Саўгас гэты размешчаны побач са старажытным паркам і маляўнічымі сажалкамі, таму было праяўлена максімум клопату аб тым, каб арганічна ўвязаць архітэктуру будынкаў з ландшафтам, цалкам захаваць насаджэнні, рэльеф, водныя люстры.

Вось як, напрыклад, павінен выглядаць грамадскі цэнтр пасёлка, размешчаны на скрыжаванні дзвюх узаемна перпендыкулярных вуліц, што ўтвараюць пасялковую плошчу. Паўднёвы бок яе будзе забудоўвацца гандлёвымі і адміністрацыйнымі будынкамі. Галоўны акцэнт бярэ на сябе вялікі клуб на 400 месц. Ён замыкае перспектыву галоўнай вуліцы, вырашанай у выглядзе шырокай алеі, якая аддзяляе жыллё ад праезджай часткі. Другая вуліца-алея вядзе да вытворчай зоны. З яе адкрываецца від на новы мост і старажытны парк.

Высокія дрэвы, якія акружаюць клубны ўчастак і новыя пасадкі, быццам служаць працягам парку, ствараючы адзіную сістэму зялёных насаджэнняў, гарманічна звязаную з прыгожымі сажалкамі. Самая вялікая з іх з нізкімі берагамі плаўна агінае найбольш зручныя для забудовы месцы. У ёй адлюстроўваецца клубны будынак. На беразе афармлены сход да вады і водная станцыя.

Звязан з прыродай і жыллёвы комплекс. Ён складаецца з чатырох груп двухпавярховых шаснаццацікватэрных дамоў, аб'яднаных зялёнымі дворыкамі, Свабоднае размяшчэнне жылой забудовы сярод ландшафту дазваляе дамагчыся зручнай арыентацыі дамоў, забяспечыць добры агляд мясцовасці амаль з усіх пакояў: дамы ў асноўным адкрыты на поўдзень, у бок парку і сажалак.

Праект гэты ўжо ажыццяўляецца, і ён трапіў у разрад паказальных. Гэта ў многім вызначыла яго лёс, у прыватнасці, дало магчымасць адмовіцца ад папярэдняга праекта, які часткова пачалі ажыццяўляць, што прывяло б да хаатычнай забудовы унікальнага парку жылымі і гаспадарчымі будынкамі і зносу былога маёнтка, узятага пад ахову закона помніка архітэктуры XIX стагоддзя.

Ну, а як бы склаўся лёс парку і пасёлка, калі б ён не трапіў у разрад паказальных? Як бы наогул вялося яго праектаванне, калі б аўтары не дамагліся ў парадку выключэння (так, так, выключэння) папярэдняй тапаграфічнай здымкі мясцовасці і не патрабавалі б улічыць не толькі кожны будынак, але і кожнае дрэва і сажалку?

У інстытуце ўкаранілася практыка складання планіровачных схем без стараннага вывучэння ўмоў мясцовасці. Аб'ём раённых планіровак недапушчальна скарочаны, у іх не ўключаны самыя неабходныя для архітэктара тапаграфічныя звесткі. Архітэктары наогул не ўдзельнічаюць у складанні планіровачных схем, яны аддадзены на водкуп інжынерам. Без архітэктараў вызначаюцца месцы будучых пасёлкаў і мэтазгоднасць зліцця старых, іх канфігурацыя, узаемасувязь з вытворчымі зонамі і транспартнымі магістралямі, не гаворачы пра ландшафтную спецыфіку. Планіровачныя схемы распрацоўваюцца ў надта дробным пяцітысячным маштабе і не могуць служыць рэальнай асновай для складання архітэктурных праектаў.

Праектная дакументацыя, якая выходзіць са сцен інстытута, у выніку аказваецца вельмі прыблізнай. Паспрабуйце, напрыклад, найлепшым чынам размясціць па такой схеме дом, калі ён абазначаны велічынёю з запалкавую галоўку! Не здзіўляйцеся, калі ў натуры на гэтым месцы будзе роў, пагорак, касагор або група дрэў. Праектант гэтага проста не ведаў. Вось і атрымліваецца, што архітэктары «Белгіпрасельбуда» вымушаны не праектаваць, а фантазіраваць, механічна пераносячы на планшэты шаблонныя прыёмы, не ўвязаныя з канкрэтнымі ўмовамі. У адных выпадках яны прапануюць «модныя», але нічым не абгрунтаваныя крывалінейныя вуліцы на раўнінных мясцовасцях, у другіх — традыцыйную прамавугольную сетку кварталаў на тэрыторыях з перасечаным рэльефам. Так, у праектах саўгаса «Буцэвічы» Мінскай вобласці і калгаса імя Дзяржынскага на Віцебшчыне вуліцы і дамы аказалася проста немагчыма размясціць, бо спатрэбіліся б дарагія нівеліровачныя работы, таму што планіроўшчыкі ігнаравалі складаны рэльеф гэтых месц. Аўтары планіроўкі цэнтральнай сядзібы саўгаса «Зара» Мінскай вобласці не ўлічылі сажалкі, якая займае звыш дзесяці гектараў. Ні адна з вуліц не арыентавана на яго воднае люстра. Грамадскі цэнтр і парк аказаліся не звязаныя з сажалкаю, занадта аддалены ад яе.

Некваліфікаванае праектаванне дорага каштуе дзяржаве. Цяпер звыш дзвюх тысяч планіровачных схем і праектаў, выкананых у рэспубліцы, безнадзейна ўстарэлі і патрабуюць карэннай перабудовы.

Не распрацоўваюцца ў нас на сучасным узроўні і праекты зялёных насаджэнняў у сельскіх пасёлках. Яны вельмі прыблізныя і схематычныя. На сумешчаных чарцяжах паказваюцца то выцягненыя ланцужкамі ўздоўж вуліц, то рассаджаныя «квадратна-гнездавым» спосабам дрэвы і кусты, без уліку існуючых насаджэнняў, рэльефу і магчымасці развіцця і абнаўлення раслін. Аб якім жа захаванні прынцыпаў ландшафтнай архітэктуры можна пры гэтым гаварыць!

(Заканчэнне на 2 й стар.).

ЗАПРАШАЕ КНІГАРНЯ «КРЫНІЦА»

Цудоўны падарунак атрымалі аршанскія кнігалюбы. У цэнтры горада, у новым сямі-павяхровым доме адкрыўся кніжны магазін з сімвалічнай назвай «Крыніца».

У светлым прасторным памяшканні са шкла і пластыкаў — сем аддзелаў. Асобна выдзелены аддзел «Беларуская кніга».

«Крыніца» — трэці па ліку кніжны магазін у Оршы.

Л. УСВЕЙКА.

СУСТРЭЧА ТРОХ ПАКАЛЕННЯЎ

Шмат людзей сабралася ў лекцыйнай зале Гомельскай абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна на канферэнцыю чытачоў па кнізе І. Вятрова «Браты па зброі». Тут былі і школьнікі, і студэнты, і ветэраны рэвалюцыі — канферэнцыя стала цікавай і павучальнай сустрэчай трох пакаленняў. У ёй прынялі актыўны ўдзел былы камандзір Мазырскай партызанскай брыгады А. Жыльскі, былы сакратар Ельскага падпольнага райкома партыі З. Чарнаглаз, былы камандзір спецыяльнага разведвальнага атрада А. Духанін.

Перад чытачамі выступіў І. Вятроў. У абмеркаванні кнігі прынялі ўдзел Герой Савецкага Саюза Б. Калач, Г. Каплан, В. Прасава і іншыя.

НА ЗДЫМАЧНЫХ ПЛЯЦОЎКАХ

БЕЛАРУСЬ, 1917

У трэцяй кніжцы часопіса «Полымя» за гэты год быў надрукаваны літаратурны кінасцэнарый Аркадзя Кулешова і Максіма Лужаніна «Радыё — ўсім...» З урыўкам са сцэнарыя знаёміла сваіх чытачоў і наша газета. Памятаеце?

Працуе тэлеграфны ключ. Каля апарата Уладзімір Ільіч Ленін. Ён дыктуе тэлеграму ў стаўку галоўнакамандуючага Духоніна з патрабаваннем неадкладна пачаць перагаворы аб перамір'і. Генерал адмаўляецца выканаць гэтае патрабаванне.

Зноў працуе тэлеграфны ключ. Па-ранейшаму ля апарата Уладзімір Ільіч. Але на гэты раз тэлеграма адрасавана не генералу. Ленін звяртаецца да салдат—да рабочых і сялян, апранутых у шэрыя шынялі: «Салдаты! Справа міру ў вашых руках. Няхай палкі, якія стаяць на пазіцыях, выбіраюць зараз жа ўпаўнаважаных для фармальнага ўступлення ў перагаворы аб перамір'і з непрыяцелем. Савет Народных Камісараў дае вам права на гэта».

Так пачынаўся кінасцэнарый гісторыка-рэвалюцыйнага фільма, які абяцаў расказаць гледачу аб тым, як у гады першай сусветнай вайны партыя бальшавікоў змагалася за Савецкую ўладу, за захаванне міру на зямлі, пра лепшых сыноў партыі.

Падзеі, якія апісваюць сцэнарысты, адбываюцца на перадавых лініях рускіх акопаў, у штабных бліндажах рускай і нямецкай армій, на казацкай гаўптвахце, на прыфрантавой чыгуначнай станцыі, у турме, на вуліцах старога Мінска і іншых месцах.

Цяпер па гэтым сцэнарыі на студыі «Беларусфільм» здымаецца шырокаэкранны мастацкі фільм. Здымні праходзяць на Гродзеншчыне. Рэжысёр-пастаноўшчык — народны артыст БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Ул. Корш-Саблін, галоўны аператар — Ю. Фогельман.

У фільме будуць заняты артысты Масквы, Ленінграда, Мінска і іншых гарадоў. Ролю камандзіра грэнадзёрскага палка Пятра Камлюка выконвае артыст МХАТа Юрый Пузыроў. У ролях сялян Хведара і Сіваварона здымаюцца народны артыст СССР Глеб Паўлавіч Глебаў і народны артыст БССР Уладзімір Іосіфавіч Дзядзюшка. Народны артыст БССР Здзіслаў Францавіч Стома заняты ў фільме ў ролі аканома маёнтка.

У эпізадычных ролях і масавых сцэнах удзельнічаюць артысты Магілёўскага тэатра музычнай камедыі, жыхары Гродна, воіны Гродзенскага гарнізона.

Фільм прысвячаецца 50-годдзю Савецкай улады.

Адзін з аўтараў сцэнарыя Максім Лужанін (у цэнтры) на здымках фільма.

Камісар палка — артыст МХАТа Юрый Пузыроў (справа) і нямецкі салдат Курт — артыст Рыжскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя Я. Райніса Улдыс Ліелдзідж.

У ролі Сашы Шумігая — артыст Маскоўскага малога тэатра Аляксандр Патапаў (злева).

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, жыхар горада Гродна Фёдар Цімафеевіч Анішчанка на здымках фільма.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ. (БЕЛТА).

ПУСЦІЦЕ АРХІТЭКТУРУ Ў ВЁСКУ!

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

Даўно пара ў праектнай дакументацыі па сельскаму будаўніцтву прадугледжваць схемы комплекснага азеляненння раёнаў і пасёлкаў з улікам іх функцыянальнага і эстэтычнага прызначэння. Такія схемы з'явіліся б адпраўным дакументам для ўсіх наступных мерапрыемстваў па выкарыстанню і развіццю насаджэнняў. Яны павінны быць увязаны са знешнімі зонамі лясоў і лесапаркаў, а таксама з сумежнымі гаспадаркамі, каб там, дзе гэта мэтазгодна, ствараць узбуйненыя зялёныя масівы для групы гаспадарак. Само па сабе зразумела, што ў іх трэба прадугледжваць закладку гадавальнікаў для забеспячэння зялёнага будаўніцтва на вёсцы пасадачным матэрыялам.

Неабходна, нарэшце, у дапамогу сельскім будаўнікам, ды і архітэктарам, наладзіць рэгулярнае выданне дапаможнікаў па ландшафтнай архітэктуры не толькі з чарцяжамі дамоў і тыпавымі планіровачнымі схемамі, але і з рознымі варыянтамі аб'ёмна-прасторавых ландшафтных кампазицый. Дарэчы нагадаць у сувязі з гэтым, што яшчэ Пётр I надаваў вялікае значэнне падобным дапаможнікам. У 1722 годзе ім быў выдадзены ўказ «Аб будаўніцтве сялянскіх двароў па спецыяльнаму чарцяжу» з мэтай рэканструкцыі вёсак у адпаведнасці з новымі сацыяльнымі патрабаваннямі Расіі. Гэты ўказ з часам быў значна дапоўнены і развіты. Так, у 1830 годзе ў дапамогу сельскім будаўнікам былі выдадзены на добрай паперы літаграфскім спосабам два альбомы з падрабязнымі чарцяжамі і прыкладнымі праектамі планіровак, уключаючы зялёныя насаджэнні.

Трэба аддаць належнае дойлідам таго часу—праекты іх, як правіла, вызначаліся рацыянальнасцю вырашэнняў, добрай кампазіцыяй ансамбляў, умелым спалучэннем працяжнай жылой забудовы з вертыкальнымі аб'ёмамі цэркваў, малымі архітэктурнымі формамі, масівамі дрэў. Праекты гэтыя адпавяделі духу часу, чаго, на жаль, часам нельга сказаць аб тых рэкамендацыях і тыпавых праектах, якімі вымушаны задавальняцца нашы сельскія праекціроўшчыкі і будаўнікі. Яны ўстарэлі і патрабуюць абнаўлення, бо не адлюстроўваюць карэнных змен, што адбываюцца ў жыцці вёскі.

Архітэктура, фарміруючы асяроддзе, у якім жыве і працуе чалавек, разам з тым фарміруе і самога чалавека. Уздым сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, павышэнне прадукцыйнасці працы сельскіх працаўнікоў і іх культурнага ўзроўню, прыцягненне на вёску спецыялістаў і звязаныя з гэтым складаныя дэмаграфічныя праблемы маюць у пэўнай ступені і свой архітэктурны аспект.

Радасна адзначыць, што ў апошнія гады ў гэтых адносінах намячаюцца станоўчыя зрухі. Пасля больш чым дваццацігадовага перапынку ў канцы мінулага—пачатку сёлетняга гадоў былі праведзены два ўсесаюзныя адкрытыя конкурсы на праекты планіроўкі і забудовы пасёлкаў для розных зон краіны і праекты культурна-асветных цэнтраў для іх.

Вялікая ўвага пытанням развіцця сельскай архітэктуры была аддадзена і на нядаўняй сесіі Вярхоўнага Савета РСФСР, дзе, у прыватнасці, адзначалася значнае павелічэнне асігнаванняў на жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва на вёсцы. Аналагічныя меры прымаюцца і ў іншых рэспубліках. Ці трэба гаварыць, наколькі важна так выкарыстаць гэтыя сродкі, каб яны далі найлепшыя вынікі.

Спектаклі нашых гасцей

ТРЫ ГАДЗІНЫ—У РЫМЕ

Прэм'ера — заўсёды свята для калектыву тэатра. Прэм'ера на гастролях — заўсёды сюрпрыз для гледача. Такі прыемны сюрпрыз паднёс мінчанам калектыў Харкаўскага тэатра музычнай камедыі: была паказана прэм'ера музычнай камедыі італьянскага кампазітара Горні Крамера «Нядзеля ў Рыме» (пераклад тэксту Гарынеі і Джаваніні з італьянскай мовы і сцэнічная рэдакцыя ажыццёўлены А. Гусевым).

Тэмы, узнятыя ў спектаклі, не новыя ў мастацтве, але яны выклікаюць цікавасць гледача сваёй гуманістычнай накіраванасцю, сатырычным выкрыццём пачварных з'яў сучаснага капіталістычнага свету. Гэта спектакль пра «маленькага чалавека», сціплага, непрыкметнага, нясмелага, прыгнечанага мараллю «свабоднага свету», чалавека таленавітага, які імкнецца вырвацца з маральных і матэрыяльных ціскоў, знайсці сваё месца ў жыцці, атрымаць права на каханне. Гэта спектакль пра дзяўчынку з народа, чыстую душой, якая сваім каханнем памагае каханаму выпрастацца, узняць галаву, стаць чалавекам. Гэта спектакль пра сучасную італьянскую моладзь і яе супраціўленне згубнаму ўплыву прагнілай маралі «страчанага пакалення».

Рэжысёр-пастаноўшчык заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР М. Веразаў убачыў у п'есе матэрыял для стварэння спектакля востра сатырычнага, выкрываўчага і разам з тым прасякнутага думкаю аб вялікай сіле кахання, аб чысціні пачуццяў і думак простых людзей. Іменна так успрымаецца работа рэжысёра. Спектаклю ўласцівы энергічны тэмп, дынамічнасць развіцця дзеяння.

Многія цікавыя мізансцэны, трапныя рэжысёрскія знаходкі сведчаць аб вялікім творчым вопыце пастаноўшчыка. Так, напрыклад, дасціпна вырашана рэжысёрам сцэна няўдалага самазабойства галоўнага героя камедыі — настаўніка Рэната Туці, сцэна ў школе, сцэна здымак кіназоркі з выхадам герояў у глядзельную залу. Гэты ж прыём, такі арганічны тут, абарачаецца штучнасцю і наўмыснасцю, калі дзяўчаты «з народа» выходзяць у залу і выстройваюцца ўздоўж аркестровай ямы з адзінаю мэтай — даспяваць сваю песню, а затым вяртаюцца на падмосткі і аднаўляюць тую ж, што ў пачатку, «замарожаную» мізансцэну.

Разам з тым нельга не адзначыць, што другі акт аказаўся трошкі слабейшы за першы і трэці: «завязка» і «развязка» сюжэта, ярка пададзеныя ў крайніх актах, выгадна адрозніваюцца ад больш спакойнай «плыні» дзеяння ў другім акце, які амаль нічога не дадае ў дынаміку развіцця вобразаў.

Творчая зацікаўленасць рэжысёра, калі можна так сказаць, яго захапленне работай знайшлі, як відаць, гарачы водгук у акцёраў. Цэнтральныя персанажы спектакля «адліты» ў яркія, выразныя вобразы, надзеленыя дакладна знойдзенымі характарыстыкамі.

На першым месцы стаіць тут вобраз настаўніка Рэната Туці ў выкананні артыста В. Якаўлева. Акцёру ўдалося стварыць вобраз «маленькага чалавека», высакароднага і разумнага, але пазбаўленага ўсяго: работы, грошай, кватэры, права на асабістае шчасце. Пераканаўча паказвае В. Якаўлеў эвалюцыю свайго героя. Пад уплывам падзей, з дапамогай Джаваны, якую ён кахае пяшчотна і палка, баючыся прызнацца ў гэтым нават самому сабе, Рэната — Якаўлеў спрабуе скінуць з душы камень прыніжанасці і баязлівасці, спрабуе адмовіцца ад «поўзання» па жыцці і робіць першыя спробы «ўзляцець». Яго чалавечая годнасць праяўляецца ўжо ў сцэне з вучнямі, у класе, калі, сціснуўшы кулакі (як вучыла яго Джавана), ён робіць свае першыя нясмелыя крокі.

І далей — у сцэнах з «кіназоркаю» Сафілінай, з міністрам настаўнік Туці пачынае ўсё больш адчуваць сябе сапраўдным чалавекам.

В. Якаўлеву верыш, яго герою шчыра сімпатызуеш. Я бачыла артыста ў іншых спектаклях—у ролі рэвалюцыйнага французскага матроса Франсуа («На світанні»), у дзвюх ролях братоў-блізнят Шандара і Ласла, мараль якіх знаходзіцца на процілеглых полюсах («Цыганскае каханне»). Новая работа артыста яшчэ раз сведчыць аб яго ўменні пранікаць у глыбіні характараў герояў, аб майстэрстве пераўвасаблення.

Вартая яго партнёрка — заслужаная артыстка КАССР Л. Перавошчыкава. Яна іграе ролю Джаваны Чарэці — простай дзяўчыны, дачкі гаспадара бара. Выхаваная больш вуліцаю, чым школай і кнігай, Джавана, тым не менш, увасабляе ў сабе рысы высакароднасці, сардэчнай прыгажосці; ёй уласцівы пачуцці справядлівасці, вялікай чалавечнасці. У гэтай ролі, мне здаецца, артыстка ярчэй, чым у іншых спектаклях, раскрывае душэўныя якасці і пачуцці сваёй гераіні, шчодра дзеліцца імі з гледачом. Джавана — Перавошчыкава адкрытая насустрач харошаму і «замкнёная» пры сустрэчы з брудам навакольнага свету; нясмелая ў выказванні сваіх пачуццяў да настаўніка, яна ў той жа час адважна і нават дзёрзка змагаецца за яго, за абуджэнне ў ім чалавека.

Удача спектакля — камедыйны «дуэт»: Ганібал Чарэці і Аўгуста Панічэці. Бацька Джаваны Ганібал— яркі камедыйны вобраз, выдатна «зляплены» артыстам К. Райданавым з мноства «дробных дэталей», большасць з якіх узята з арсеналу «ўнутраных» сродкаў. Артыст раскрывае характар свайго героя, пераконваючы ў лагічнасці яго ўчынкаў.

Артыстка Н. Сіль у ролі Аўгусты—кватэрнай гаспадыні настаўніка—радуе яркім камедыйным талентам і бездакорным густам—спалучэнне, якое не так ужо часта сустрэнеш у аперэце...

У выкананні таленавітага артыста Б. Чарнова бліснуў востра сатырычны вобраз Скардок'я. Напэўна, у рабоце над гэтай роллю акцёру давялося добра-такі папрацаваць. Трэба было сыграць маральную пачвару, прагнілае стварэнне, разбэшчанага юнака, які зусім вызваліў сябе ад усіх маральных абавязкаў. Цынізм, бессаромная нахабнасць, шантаж у спалучэнні з поўнай адсутнасцю элементарнай культуры («гэты хімік... Петрарка...»), элементарных школьных ведаў — вось тыя «адпраўныя пункты», якія бачыў перад сабою акцёр. Вынік яго работы аказаўся вельмі ўдалым. Калі дадаць да сказанага вышэй, што артысту даводзіцца шмат «твіставаць» і адначасова з гэтым спяваць, стане ясна, што ўдача дасталася Б. Чарнову нялёгка.

Цікавая работа артысткі А. Арлоўскай над вобразам кіназоркі Сафіліны Лалоэ. Праўда, дзе-нідзе яе гераіня выглядае занадта вульгарнай.

І калі нават дапусціць, што гэта «зорка» трэцяй велічыні, усё роўна цяжка пагадзіцца з такой трактоўкай.

У спектаклі ёсць рад маленькіх роляў, якія запамінаюцца дзякуючы ўдаламу акцёрскаму ўвасабленню. Гэта міністр асветы Асвальда Партоні Грыфі (арт. П. Руцінскі), рэжысёр (засл. арт. УССР К. Перадзернікаў), памочнік рэжысёра (арт. А. Котаў).

Удалы, добра зладжаны акцёрскі ансамбль вызначае поспех спектакля. Аднак музычная камедыя — гэта і вялікая колькасць музыкі: гэта аркестр, хор, балет, салісты. Якое ж музычнае гучанне спектакля?

Аркестр пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора тэатра Б. Чабаксарава пакідае прыемнае ўражанне. Дырыжор строга, тактоўна праводзіць спектакль, наладжваючы кантакт з выканаўцамі. Да аркестра чула прыслухоўваецца хор (хормайстар Э. Чарняк). Што датычыць салістаў, дык у Харкаўскім тэатры могуць ганарыцца тым, што яго акцёры ўдала спалучаюць высокае акцёрскае майстэрства з наяўнасцю сапраўдных галасоў і вялікай музычнасці. Зазначу дарэчы, што слухачоў аперэты ўжо даўно спрабуюць прывучыць да таго, што ў «лёгкім» жанры трэба адносіцца да вакалу паблажліва. У гэтым сэнсе трупа Харкаўскага тэатра выгадна адрозніваецца ад некаторых іншых калектываў, якія нам даводзілася чуць у Мінску. На рэдкасць галасісты тэатр!

У новым спектаклі хочацца адзначыць выканаўцаў цэнтральных роляў, якія дэманструюць дастаткова прафесіянальны вакал.

Балетмайстар М. Міксер меў перад сабою нялёгкую задачу. Яму трэба было спалучыць у спектаклі стыхію народнага італьянскага танца са стыхіяй сучаснага твісту, які літаральна паланіў зарубежную моладзь. Трэба з прыемнасцю адзначыць, што ў пастаноўцы твісту балетмайстар не выйшаў за рамкі мастацтва, не перайшоў мяжу, за якой мог пачацца разгул «малпападобных». Гэты танец нясе ў спектаклі пэўную сатырычную нагрузку. Што ж датычыць народных танцаў, то яны цалкам вытрымліваюць нялёгкую «канкурэнцыю» з «модным» твістам.

Поспех спектакля павінен падзяліць і мастак С. Іофе. Добрыя дэкарацыі, лёгкія і дасціпныя, прыгожая паўзаслона, якая падзяляе дзеянне на карціны. Дэкарацыі спектакля не адцягваюць увагі гледача, наадварот, яны «працуюць» на агульную справу. Пярэчанні выклікаюць некаторыя касцюмы. Празмернае мноства фарбаў, фасонаў, некаторая вычварнасць адзення, у якое апрануты ўдзельнікі масавых сцэн ды і сёй-той з салістаў, у нейкай меры грашаць супраць густу.

...Удалечыні сцвяцца «агні вялікага горада». Па вуліцы ідзе настаўнік Рэната Туці. У яго руках — клетка з канарэйкай Джуззэ. Ён пакідае горад, бо ў яго няма нічога, што ўтрымлівала б яго тут. Каханне да Джаваны, як яму здаецца, не прывядзе да ўзаемнасці...

Аднак у музычнай камедыі неазбежны добры канец. Настаўнік сустракае Джавану, адважваецца, нарэшце, сказаць ёй пра свае пачуцці і ў адказ чуе гарачае прызнанне.

Добры канец... Але глядач выходзіць з тэатра з трывогаю ў сэрцы. Як складзецца далейшы лёс герояў? Якімі шляхамі пойдзе па жыцці гэтая моладзь? Якое цяжкае жыццё! Патрэбны смеласць, сілы, грамадзянская мужнасць, каб выстаяць, застацца чалавекам...

Такія думкі абуджае гэты вясёлы спектакль, і ў гэтым яго вартасць.

А. РАКАВА.

ПА МАТЫВАХ РАМАНА «РАЗГРОМ»



Мастак Людвіг Асецкі рыхтуецца да чарговай рэспубліканскай выстаўкі. Ён працуе над серыяй графічных лістоў па матывах рамана Аляксандра Фадзеева «Разгром». Некалькі з гэтых лістоў вы бачыце на здымках.

ТВОРЧАЯ ДРУЖБА

У метадычным кабінеце Ваўкавыскага раённага Дома культуры ёсць шмат матэрыялаў аб вопыце работы клубаў і бібліятэк Літоўскай ССР. І гэта невыпадкова.

Кедайняйскі аддзел культуры братняй рэспублікі і Ваўкавыскі не першы год спаборнічаюць. Яны часта абменьваюцца канцэртамі, дзеляцца новымі формамі і метадамі культурна-асветнай работы.

Многія стэнды метадычнага кабінета Дома культуры прысвечаны гэтай творчай дружбе.

Нядаўна дэлегацыя літоўскіх работнікаў культуры пабывала ў Ваўкавыскім раёне, пазнаёмілася з работай перадавых клубаў, бібліятэк, з дзейнасцю гурткоў мастацкай самадзейнасці.

А. АЛІН.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

ЗВЫШЗАДАЧА ЯЕ ЖЫЦЦЯ

Сярод выдатных здабыткаў тэатра імя Янкі Купалы пачэснае месца заняў спектакль «Людзі на балоце». У тым, што ён з'явіўся на свет, ёсць немалая доля працы і Зінаіды Іванаўны Браварскай — аднаго з аўтараў інсцэніроўкі рамана І. Мележа, а таксама рэжысёра спектакля, бліжэйшага памочніка пастаноўшчыка Б. Эрына. Разам з іншымі стваральнікамі спектакля яна аддала гэтай справе частку свайго гарачага сэрца.

Выхаванка Маскоўскага дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага, Зінаіда Браварская яшчэ перад вайной звязала свой лёс з купалаўскім тэатрам. Як актрыса яна часта звярталася да вобразаў беларускай савецкай драматургіі. І нярэдка дамагалася добрых вынікаў.

З вялікага рэпертуарнага спісу Зінаіды Іванаўны хочацца на пачатку назваць ваенурача Іванову («Цытадэль славы» К. Губарэвіча) і французскую рэвалюцыянерку Жанну («На досвітку» А. Макаёнка). Для паспяховага выканання гэтых роляў у актрысы былі ўсе падставы. Што прываблівае гледачоў у названых намі вобразах? Незвычайная абаяльнасць і выразная «звышзадача», умельства вылучыць на першы план асноўнае «зерне» ролі.

Іванова запомнілася як савецкая жанчына, для якой адданасць народу, служэнне яму—галоўная мэта жыцця. Мы адчуваем шчырую чалавечнасць ваенурача, верым у яе самаахвярнасць у часы цяжкіх выпрабаванняў, якія выпалі на долю Радзімы. Без мітуслівасці і істэрычнасці, з высокім напружаннем волі, душэўных сіл здзяйсняецца патрыятычны абавязак. У межах дадзенага п'есай матэрыялу артыстка намалявала характар, у якім жаноцкасць спалучаецца з мужнасцю, арганізатарскія здольнасці з талентам пранікнення ў глыбіні людскіх сэрцаў.

Другая гераіня Браварскай — Жанна — палымяны змагар за мір, свабоду і незалежнасць роднай Францыі, за яе шчасце і росквіт. Зінаіда Іванаўна глыбока і ўсхвалявана аналізуе драматычны канфлікт, які ўзнік у сям'і маладой жанчыны, яе барацьбу з бацькам-капіталістам. У гэтым вобразе выявілася сталае майстэрства актрысы. За «ювелірнымі» дэталямі не губляецца сацыяльны партрэт гераіні, пралетарскі інтэрнацыяналізм Жанны. Нездарма яна стала адной з цэнтральных фігур у спектаклі купалаўцаў.

У тым жа псіхалагічным плане, у якім вырашаліся вобразы Івановай і Жанны, намаляваны Ірына («Вогненны мост» Б. Рамашова) і Крысціна Хелмэр («Паўночная мадонна» братоў Тур).

Гераіні З. Браварскай — у большасці людзі прыгожыя, адухоўленыя, акрыленыя, інтэлігентныя. Гэтыя рысы ўласцівы і Ксеніі Іванаўне («Палата» С. Алёшына), і Машы («У добры час» В. Розава). Ясная грамадзянская пазіцыя артысткі ў гэтых вобразах, выразны яе «почырк». Ксенія разумная, дасціпная, трошкі гарэзлівая, тэмпераментная, з глыбокімі, шчырымі пачуццямі, рашучая ў сваіх дзеяннях, смелая і адданая ў каханні. Быць карыснай людзям, дамагацца шчасця для іх, любіць іх — такі жыццёвы ідэал Машы.

У творчым актыве артысткі—беларуская дзяўчына Зоська («Салавей» Зм. Бядулі), вобраз якой намаляваны фарбамі тужлівай лірыкі, і Ядзя—ганарлівая жонка пана Капусты («Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча). Для ролі Ядзі былі знойдзены трапныя, сатырычныя, нават гратэскавыя рысы.

Але асабліва ярка і поўна раскрыўся шматгранны талент актрысы ў класічным рэпертуары. Нора («Лялечны дом» Г. Ібсена) і Юлінька («Даходнае месца» А. Астроўскага) — вобразы розных планаў. У першым выпадку гераіня з драматычным лёсам, у другім — востракамедыйны вобраз. Увасабленне такіх палярна-процілеглых характараў патрабавала розных сродкаў сцэнічнай выразнасці. Трэба сказаць, што З. Браварская як актрыса раскрылася ў гэтых спектаклях ва ўсім багацці сваёй індывідуальнасці, якой аднолькава даступны і высокая трагедыя і сатырычная камедыя, нават фарс.

Выконваючы ролю Норы, З. Браварская выразна падкрэслівала сувязь асабістай драмы сваёй гераіні з норавамі буржуазнай сям'і, з умовамі, у якіх вымушана яна жыць, з тым пачварным светам маны і хлусні, які бязлітасна выкрываецца Ібсенам. На купалаўскай сцэне раскрываўся працэс вызвалення жанчыны ад дробнабуржуазных ілюзій, ад веры ў трываласць сям'і, што грунтуецца на ілжывай маралі. Эвалюцыя псіхалогіі і свядомасці Норы, нараджэнне ў яе пратэсту супроць рэчаіснасці падаваліся ў спектаклі не проста лінейна, а ва ўсёй складанасці працэсу. Гераіня Браварскай была пяшчотнай, звычайнай жанчынай з вялікім сэрцам. Яна не «цацка» ў руках мужа, а чалавек, які ненавідзіць пошласць і бруд у адносінах паміж людзьмі.

Вобраз Норы ўвачавідкі паказаў маштабнасць таленту актрысы.

Юлінька — дастойны нашчадак сваёй маці, удавы-чыноўніцы Кукушкінай, мэта ўсяго жыцця якой — найлепш уладзіць дачок. У гэтай ролі асабліва прыкметнае было пераўвасабленне артысткі, багацце палітры яе акцёрскіх фарбаў.

Дакладнае разуменне стылю драматургіі і яркі драматычны тэмперамент выявіла артыстка ў вобразах Клеі («Ліса і вінаград» Г. Фігейрэда), а таксама хікметаўскіх гераінь — Жонкі Доктара («Забыты ўсімі») і Ніхаль («Дзівак»). Захапленне розумам Эзопа — галоўны пафас усіх дзеянняў халоднай, разважлівай прыгажуні Клеі. Аднак, і гэта акцэнтуе артыстка, пачуццё Клеі не такое ўжо вялікае і палымянае, каб у імя яго яна была здольна на самаахвярнасць...

Жонцы Доктара ўласцівы цынічны разлік, эгаістычная самаўлюбёнасць, драпежная абыякавасць да людзей, якія яе акружаюць.

Браварская ўмее чытаць думкі сваіх гераінь, жыць іх трывогамі і радасцямі, надзеямі і душэўнымі імкненнямі. Літаратурную першаасноў вобраза яна намагаецца ўзбагаціць уласнымі пошукамі, дапытлівым роздумам. У артысткі добра развітая інтуіцыя, але яна, інтуіцыя, ніколі не прыходзіць у канфлікт з ідэйнай накіраванасцю мастака, а эмацыянальнасць не становіцца ружовай, сентыментальнай.

Зінаіда Іванаўна Браварская перайграла безліч роляў, добрых і розных, часцей усё ж розных... Але ж дагэтуль не сыграла той адзінай, «запаветнай», аб якой акцёр звычайна марыць усё жыццё, якую шукае ў кожнай новай п'есе...

А час ідзе. Набліжаецца 50-гадовы юбілей...

Нам заўсёды здавалася, і цяпер гэта асабліва непакоіць, што Браварская — актрыса значна больш шырокіх магчымасцей, чым гэта заўважана і выкарыстана ў тэатры. Інтэлектуальная творчая культура, неабмежаваная, «шматжанравая» палітра яе пры ўвазе рэжысуры могуць даць большы плён.

Вялікае месца ў творчай біяграфіі Зінаіды Іванаўны Браварскай займае радыётэатр, асабліва мастацкае чытанне. Артыстка валодае цудоўнай дыкцыяй, музычным мілагучным голасам. У ім многа цёплых, шчырых інтанацый і адценняў, якія з прафесіянальным умельствам выкарыстоўваюцца пры выкананні твораў розных жанраў і аўтараў, на беларускай і рускай мовах. Паміж радыёслухачамі і Зінаідай Іванаўнай існуе шчыльны сардэчны кантакт. Слухаеш артыстку — не толькі чуеш, але заўсёды «бачыш» яе гераінь, спачуваеш ці радуешся з імі, дамалёўваеш уяўленнем іх аблічча.

З. Браварская з большым ці меншым поспехам неаднаразова спрабавала свае сілы і ў галіне рэжысуры — і ў тэатры і на радыё («Мільён за ўсмешку» А. Сафронава, «Я так хачу» Р. Раманава» і інш.). Магчыма, у гэтым карэнні яе бездакорнага адчування ансамбля і адсутнасці такой распаўсюджанай на тэатры з'явы, як акцёрскі «эгаізм». Яна ніколі не супрацьстаўляе інтарэсы сваёй яркай індывідуальнасці інтарэсам і задачам калектыву. Гэта сведчанне не толькі высокага эстэтычнага густу і акцёрскай культуры, але, калі хочаце, і грамадзянскай пазіцыі мастака.

Зінаіда Браварская заўсёды жыве інтарэсамі ўсяго калектыву, актыўным, да берагоў напоўненым грамадскім жыццём. Такой яе ведалі ў нас вайны ў Куйбышаўскім драматычным тэатры. Такая яна і ў Мінску, дзе доўгі час была сакратаром партарганізацыі тэатра.

Заслужаная артыстка рэспублікі Зінаіда Іванаўна Браварская сваёй натхнёнай творчай і адданай грамадскай працай здабыла шырокую папулярнасць у гледачоў. Хочацца часцей бачыць яе на акадэмічнай сцэне.

Міхась МОДЭЛЬ.

СЯРОД КНІГ

ЯШЧЭ ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ДЗВЕ...

Аўтабіяграфіі пісьменнікаў — нібы акно, праз якое можна зазірнуць у вельмі разнастайны, шматфарбны свет эмоцый, пачуццяў, думак чалавека-мастака, у яго творчую лабараторыю. Нездарма ж яшчэ ў школе кожны з нас з захапленнем чытаў пісьменніцкія біяграфіі.

Па пяцідзесяці чатырох жыццёвых дарогах прайшлі мы ўслед за нашымі беларускімі пісьменнікамі, чытаючы кнігу іх аўтабіяграфічных матэрыялаў «Пяцьдзесят чатыры дарогі» (1963). Цяпер перад намі — яшчэ шэсцьдзесят дзве жыццёвыя дарогі: зборнік аўтабіяграфій беларускіх пісьменнікаў «Пра час і пра сябе».

Кніга перш за ўсё дае яскравае ўяўленне пра тое пакаленне пісьменнікаў, дзяцінства або юнацтва якіх было абпалена полымем Вялікай Айчыннай вайны. Адны з іх юнакамі прайшлі са зброяй у руках па франтавых дарогах, другія спазналі жахі фашысцкай акупацыі. Вучыліся і спрабавалі яны свае творчыя сілы ў нялёгкія пасляваенныя гады. Вайна паклала дужа глыбокі след у іх душах, светаразуменні, светаўспрыманні, стала адной з галоўных тэм іх творчасці.

Уключаны ў кнігу і аўтабіяграфіі некаторых старэйшых пісьменнікаў, для якіх часам першых творчых поспехаў былі 20-я — 30-я гады. Апублікавана і некалькі аўтабіяграфій тых, хто не дажыў да нашых дзён (П. Галавач, М. Васілёк і інш.).

І ўжо тут пры першым беглым знаёмстве з кнігай, з'яўляецца недаўменне: якім прынцыпам кіраваліся ўкладальнік і рэдактар зборніка пры адборы аўтабіяграфій пісьменнікаў? Чаму ні ў першую, ні ў другую кнігу не трапілі аўтабіяграфіі такіх пісьменнікаў, як, напрыклад, В. Сташэўскі, С. Баранавых, Ул. Галубок, В. Каваль, Б. Мікуліч, Ю. Таўбін, Ул. Хадыка і многія іншыя, чые імёны не павінны быць забыты? Невядома таксама, чаму адсутнічаюць у зборніках і аўтабіяграфіі некаторых вядомых сучасных пісьменнікаў, напрыклад, Я. Маўра, П. Панчанкі. Абыдзены чамусьці многія сучасныя паэты, крытыкі і літаратуразнаўцы. Аб усім гэтым можна толькі пашкадаваць. І хочацца спадзявацца, што гэтыя ўпушчэнні будуць улічаны пры падрыхтоўцы трэцяй кнігі пісьменніцкіх аўтабіяграфій, патрэба ў якой відавочная.

Ужо сам загаловак кнігі «Пра час і пра сябе» вызначае галоўны яе кірунак. І шкада, што не ўсе аўтабіяграфіі напісаны ў адпаведнасці з гэтым кірункам. Адна справа, калі чытаеш аўтабіяграфію прызнанага майстра — пісьменніка, вядомага ўсім са школьнай парты. Кожная старонка яго дзяцінства, жыццёвага шляху і творчага вопыту пашырае нашы веды аб ім, паглыбляе ўспрыняцце яго твораў, мы сустракаем яе як вельмі патрэбную і важную. Іншая справа, калі перад намі аўтабіяграфія чалавека, які яшчэ ў пачатку грамадзянскага і творчага ўзмужнення. Тут для нас самым важным з'яўляецца разуменне самога працэсу ўзаемаадносін асобы пісьменніка са сваім часам, грамадствам, народам, высвятленне кірунку яго нялёгкіх творчых пошукаў.

Думаецца, што кніга, пра якую ідзе гаворка, і падрыхтоўвалася не толькі як зборнік аўтабіяграфій, а яшчэ і як кніга роздумаў пра час і пра сябе. Невыпадкова, мусіць, як прызнаецца Ул. Нядзведскі, укладальнік зборніка Я. Казека папярэджваў пісьменнікаў, каб яны не захапляліся апісаннямі дзяцінства («колькі птушыных гнёздаў разбурылі ў маленстве»).

Безумоўна, у кожнага чалавека ёсць сваё адзінае ў свеце месца, пра якое ён ніколі не забудзе, з якім звязаны самыя яркія і дарагія ўспаміны аб непаўторным дзяцінстве. І можна зразумець пісьменнікаў, якія вельмі часта захапляюцца апісаннямі свайго маленства і юнацтва. Аднак шкада, што ў многіх аўтабіяграфіях аб гэтым гаворыцца занадта шмат, затое зусім мала — аб творчай вучобе, творчых пошуках, задумах і здзяйсненнях. Наогул у аўтабіяграфіях амаль не ставяцца пытанні тэорыі, пытанні паэтычнай творчасці.

Кажучы гэта, я не раблю абагульненняў. Лепшыя аўтабіяграфіі (А. Пальчэўскага, С. Шушкевіча, Р. Шкрабы, С. Грахоўскага, Ул. Калесніка, С. Александровіча, А. Асіпенкі, А. Бажко, А. Карпюка і некаторых іншых) няблага расказваюць пра час і абставіны, у якіх прыходзілася пісьменнікам жыць і працаваць, пра жыццёвую аснову іх твораў, незабыўныя сустрэчы са старэйшымі майстрамі слова, вядомымі пісьменнікамі.

Аўтабіяграфіі Ул. Калесніка і А. Карпюка, напрыклад, раскрываюць характар узаемаадносін чалавечай асобы і грамадства ў былой Заходняй Беларусі, своеасаблівасць і складанасць станаўлення прадстаўнікоў народнай інтэлігенцыі, значэнне для малодшага пакалення пісьменнікаў творчага вопыту М. Танка, Я. Брыля, асабістых кантактаў з імі. С. Александровіч апісвае літаратурнае жыццё Капыля 30-х гадоў, паказвае, як пад непасрэдным уплывам землякоў — Ц. Гартнага, А. Гурло і інш. складваліся асабістыя літаратурныя інтарэсы. Цікавыя штрыхі пра чалавечнасць і бацькоўскае стаўленне да літаратурнай моладзі К. Чорнага сустракаюцца ў аўтабіяграфіі А. Асіпенкі. Заклапочанасць станам сучаснай беларускай крытыкі і літаратуразнаўства адчуваецца ў аўтабіяграфіі Р. Шкрабы.

Пісьменніцкія аўтабіяграфіі пераканальна сведчаць аб тым, што маладому пісьменніку ў яго творчай працы і росце не дапамогуць ні сюжэтныя хітраспляценні, ні літаратурныя рэмінісцэнцыі, ні слязлівая меладраматычнасць, ні саладжавая, гучная рыторыка і патэтыка, ні выпрабаваныя літаратурныя схемы і каноны, калі ў яго творах не будзе галоўнага — сапраўднага жыцця, часцінкі пісьменніцкага жыццёвага ці духоўнага вопыту. Нават самае ўдалае мастацкае пераўвасабленне не будзе такім паэтычным і натуральным, калі яно не будзе абапірацца на канкрэтны жыццёвы вопыт. Вельмі шмат думак і пачуццяў павінна прайсці праз розум і сэрца пісьменніка, дужа многа ён павінен перажыць і перабачыць, каб прымусіць затрапятацца, забіцца сэрца чытача ва унісон, у такт свайму, заваяваць яго давер да таго, што паказана ў творы. Напрыклад, толькі ў апошніх аповесцях «Ларыса», «На другой зіме вайны», звярнуўшыся да непасрэдна аўтабіяграфічнага матэрыялу, Л. Арабей дасягнула прыкметных зрухаў у сваёй творчасці, асабліва ў параўнанні са схематычнымі і ілюстрацыйнымі аповесцямі «Мера часу» і «Экзамен». У аповесцях «Ларыса», «На другой зіме вайны» апавяданне сагрэта жывым чалавечым пачуццём, наглядаецца мастацкая дакладнасць і пераканальнасць у абмалёўцы жыццёвых фактаў і з'яў. З глыбокім пранікненнем у жыццё звязаны послех аповесці А. Савіцкага «Кедры глядзяць на мора». На аснове жыццёвага матэрыялу, цесна звязанага з біяграфіяй пісьменніка, напісаны лепшыя старонкі рамана А. Асіпенкі «Вогненны азімут». Аўтабіяграфіі пісьменнікаў праліваюць яркае святло на жыццёвую першаснову твораў, робяць зразумелай творчую зацікаўленасць пісьменніка тымі або іншымі тэмамі, ідэямі, вобразамі, характарамі, кірунак яго пошукаў, поспехі і няўдачы.

Непрыемна толькі, што многія аўтабіяграфіі напісаны аднастайна. Спачатку «зачын», які ілюструе аўтарскую сціпласць («яшчэ мала зрабіў», «званне пісьменніка — аванс», «рана пісаць аўтабіяграфію», «яшчэ не магу лічыць сябе пісьменнікам» і г. д.), далей — «лірычнае адступленне», якое нібы паказвае пэўны адыход аўтара ад выпрацаванай схемы, пасля трохі пра сваё імя і дзень нараджэння, пра сваіх бацькоў, пра прыгажосць роднай прыроды, пра любімага выкладчыка літаратуры ў школе ці тэхнікуме, пра вайну... Пад канец — пра вучобу ва універсітэце ці інстытуце. А пра літаратурную дзейнасць — два-чатыры бібліяграфічныя абзацы: калі і што надрукавана, якія кніжкі выпушчаны ў свет. «Канцоўка» заключае прыкладна такія заклікі: жыццё кароткае, зроблена мала, трэба сплачваць доўг, трэба працаваць...

Зробленыя тут крытычныя заўвагі і меркаванні не адмаўляюць каштоўнасці і патрэбнасці кнігі «Пра час і пра сябе», якая прыхільна сустрэта студэнтамі, настаўнікамі, выкладчыкамі літаратуры, наогул усімі, хто цікавіцца гісторыяй роднай літаратуры і асабліва яе сённяшнім станам.

П. ДЗЮБАЙЛА.

«Пра час і пра сябе» Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

ВУЧНІ І НАСТАЎНІКІ

Наша мастацкая літаратура не надта можа пахваліцца творамі пра сучасную школу, пра цяжкую прафесію настаўніка. І хоць кожны з пісьменнікаў прайшоў у свой час «класы і калідоры», тэму гэтую яны чамусьці занядбалі.

Па гэтай ужо прычыне з цікавасцю бярэш у рукі кніжку апавяданняў Рыгора Рэлеса «За цеснымі партамі».

Вучні, настаўнікі — усё гэта добра знаёма аўтару: шмат гадоў свайго жыцця аддаў ён школе. Таму і кнігу напісаў з веданнем справы.

Найбольш цікавыя апавяданні — з цыкла «За цеснымі партамі». Аўтар расказвае ў іх пра справы і клопаты адной з гарадскіх вячэрніх школ. Знаёмімся з вучнямі восьмага «В» класа. Якія яны непадобныя адзін да аднаго, як яны розняцца між сабой не толькі гадамі, але і норавамі, інтарэсамі. Тут і падлеткі, і дзяцюкі, і паважаныя дзядзькі, і цёткі, якія самі маюць ужо дзяцей. Адных, непаўналетніх, «збылі» сюды дзённыя школы за слабую паспяховасць і далёка не выдатныя паводзіны; другія прыйшлі самі, каб нагнаць упушчанае ў маладосці; трэцім загадала вучыцца начальства па рабоце...

Шмат клопатаў і адказнасці ў класнага кіраўніка Канстанціна Іванавіча — педагога сумленнага, удумлівага. Ён, як кажуць, між двух агнёў. З аднаго боку — недысцыплінаваныя вучні, а з другога — загадчыца навучальнай часткі школы Эмілія Анатольеўна, якая гатова са скуры вылузацца, толькі б трымаць на належным узроўні працэнт паспяховасці.

Усе сімпатыі аўтара — на баку Канстанціна Іванавіча. Сапраўды, настаўнік не шкадуе часу, каб схадзіць на кватэру да вучня ці вучаніцы, памагчы ім як толькі можна, не ганяецца за працэнтамі. Канстанціну Іванавічу ўдаецца згуртаваць з вучняў дружны і працавіты калектыў, давесці ўсю няслушнасць фармалістычных метадаў навучання і выхавання, што насаджала ў школе Эмілія Анатольеўна. Пра ўсё гэта, паўтараю, пісьменнік піша з веданнем справы, псіхалагічна пераканальна.

Праўда, дзе-нідзе назіраюцца ў яго і непрыемныя зрывы. Возьмем гісторыю Толі Носіка. Гэты абібок дрэнна вучыцца, грубіяніць настаўнікам, без прычыны не прыходзіць на заняткі. Ні Канстанцін Іванавіч, ні іншыя педагогі не могуць даць яму рады. «Ключ» да Носіка ўдаецца падабраць чамусьці толькі вучню з таго ж восьмага «В» Федзю Ліхалату, які працуе на заводзе слесарам. Федзя бярэ Носіка да сябе на завод вучнем, і Толя непазнавальна мяняецца — не прапускае заняткаў, лепш вучыцца.

Гэтак жа хутка, нечакана і таксама без удзелу педагагічнага калектыву школы перавыхоўваюцца Пеця Заяц і Ада Колчына. І хоць у гэта нейк верыш, бо апісаныя факты ўзяты з жыцця, было б лепш, каб пісьменнік больш грунтоўна матываваў учынкі сваіх герояў.

Цыклам «За цеснымі партамі» аўтар адмаўляе паказуху, фальш у рабоце школы. Пераканаўча намаляваны сцэны правалу «педагагічнага эксперыменту» ў настаўніцы Лолы Антонаўны, сцэны правалу «метадаў» Эміліі Анатольеўны. Пісьменнік сцвярджае адносіны шчырасці і патрабавальнасці ў школьным калектыве.

Астатнія апавяданні зборніка нейкім чынам пераклікаюцца з тымі, што змешчаны ў цыкле «За цеснымі партамі», менавіта таксама «педагагічнай тэмай». Яны глыбей знаёмяць нас з дзіцячым светам, насельнікі якога з такім абвостраным пачуццём рэагуюць на несправядлівасць, незаслужаную крыўду.

Так, даволі тонка ўдалося аўтару перадаць боль і пакуты Толі Чукавіна (апавяданне «Слёзы») — сумленнага, паслухмянага, стараннага вучня, які быў незаслужана абражаны загадчыкам гаспадаркі школы Міхеевым, чалавекам чэрствым, прадузятым (у кожным школьніку ён гатовы бачыць толькі дурасліўца).

Цікавае па задуме апавяданне «Памыліліся». Выдатніцы Раі Корчык настаўнікі прадказвалі вялікую будучыню: «Гэтая птушка народжана для вялікага палёту». Але яны памыліліся. Рая, калі вырасла, стала звычайнай мяшчанкай: выйшла замуж за чалавека, прынамсі на гадоў пятнаццаць старэйшага за яе, абы жыць у дастатку. У іх асабняку дарагая мэбля. Гаспадары маюць аўтамашыну. Уздоўж сцен — акварыумы, пад столлю — клеткі з канарэйкамі. На падлозе — беленькія касматыя сабачкі. Раін муж працуе ўсяго вартаўніком, а Рая — прадаўшчыца ўцэненых тавараў, а жывуць яны «на шырокую нагу». Усе іх інтарэсы засяроджаны на багацці.

Што ж, сустракаюцца яшчэ такія людзі. Але чаму так здарылася менавіта з Раяй Корчык, якая ў школе захаплялася зусім іншым? Настаўніца Герчыкава тлумачыць перараджэнне Раі тым, што ў школе быццам яе прывучылі да прэмій. І аўтар нібы пагаджаецца з гэтым, хоць прычына маральнага спусташэння Раі, відавочна, больш глыбокая. Якая — аўтар нам так і не растлумачыў.

Пісаць пра сённяшняе жыццё школы — нялёгка, як і нялёгка працаваць у школе. Усюды шмат нязведанага, усюды патрэбны пошукі. Многімі старонкамі сваёй кнігі Р. Рэлес паказаў, што ён умее шукаць і знаходзіць.

М. КЛЫШКА.

Р. Рэлес. «За цеснымі партамі». Апавяданні. На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

ЧЫТАЛЬНЯ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

На Віцебшчыне ў саўгасе «Сіроцінскі» пабудавалі новы клуб. Два яго пакоі заняла сельская бібліятэка. У адным з іх абсталявана чытальня для дзяцей.

Настаўнікі мясцовай школы праводзяць цікавыя мерапрыемствы з юнымі чытачамі. Чытальня ніколі не пустуе.

Работай сярод дзяцей кіруе грамадскі намеснік загадчыка сельскай бібліятэкі настаўніца Тамара Паўлаўна Каніна.

НАША ГОСЦЯ — ПОЛЬСКАЯ КНІГА

Стала добрай традыцыяй кожную восень у Мінску праводзіць дэкаду польскай кнігі. Сёлета дэкада пачнецца 1 верасня. У кнігарні «Дружба» наладжваецца выстаўка - продаж польскай кнігі. Будзе шырока прадстаўлена літаратура польскіх класікаў А. Міцкевіча, Г. Сянкевіча, Ю. Крашэўскага, Э. Ажэшка, С. Жаромскага, кнігі сучасных пісьменнікаў С. Лема, С. Градзенскай, З. Залуцкага, Е. Брашкевіча, К. Брандыса, А. Рудніцкага і многіх іншых, паэзія, літаратура па мастацтву, тэхніцы, медыцыне. Вялікі выбар дзіцячай кнігі на польскай мове.

На здымку — работнікі магазіна «Дружба» Жанна Жытанская і Людміла Сарнова падрыхтоўваюць літаратуру да дэкады польскай кнігі.

Фота Ул. КРУКА.

ЗАЎСЁДЫ ПОШУК

Гэтая кніжка пісалася праз усё жыццё. Праўда, яна пісалася не на паперы. Пісалася ў памяці, у сэрцы, у пачуццях. Аўтар яе народны артыст БССР Цімох Сяргейчык — не прафесіянальны літаратар. Ён, бадай што, ніколі і не думаў брацца за пяро. У яго іншая стыхія — сцэна, яна ім завалодала з самага дзяцінства і не адступаецца на старасці. Без гэтай стыхіі ён, відаць, не мог бы ўявіць свайго жыцця, без яе ён наўрад ці знайшоў бы творчую крыніцу яго. А жыццё без творчасці — гэта гібенне. Відаць, кожны нармальны чалавек багаты на свой талент, і калі гэты талент своечасова знойдзены, ён расквітнее і разгорнецца ў вялікую сілу грамадскага быцця чалавека. Ён будзе весці яго па крутых і нялёгкіх дарогах заўсёдных пошукаў і здзяйсненняў. Гэта мае дачыненне не толькі да мастацкай творчасці, гэта заканамерна для ўсяго жыцця, для ўсіх яго «жанраў».

У кнізе акцёра Цімоха Сяргейчыка — мастака сцэны — я з захапленнем прачытаў пра Сяргейчыка — мастака палёў, ягонага брата агранома Пятра Мікалаевіча. Гэтага чалавека я даўно ведаю — з ім даводзілася бываць не раз на шырокіх разлеглаcцях калгасных палёў, на шумных сходах і нарадах, на ціхіх удумлівых семінарах калгасных паляводаў, і трэба было бачыць, як іскрыліся яго вочы, як дапытлівы розум заўсёды шукаў і радаваўся, калі знаходзіў у практыцы што новае для агранамічнай навукі. Чалавек увесь суздром аддаваўся сваёй справе, яна для яго творчасць, ягоная жыццёвая сутнасць. Чаму я расказаў тут пра старэйшага брата акцёра Цімоха Сяргейчыка? Не толькі таму, што ён харошы чалавек. Чытаеш кнігу Сяргейчыка раздзел за раздзелам, асабліва першыя старонкі яе, дзе расказваецца пра дзяцінства, пра юнацтва, пра пошукі сваіх дарог, і пераконваешся ў злітнасці, знітаванасці характараў абодвух Сяргейчыкаў, знаходзіш нешта агульнае ў падыходзе абодвух іх да з'яў жыцця і рэчаіснасці і бачыш, што гэты падыход, як правіла, быў творчы. І як бы знаходзіш тыя крыніцы, адкуль выцякаў талент Сяргейчыка-мастака.

«Нататкі акцёра» напісаны на шырокім фоне сацыяльнага жыцця, асабліва першы раздзел — «Малюнкі з мінулага». Дарма, што аўтар расказвае толькі пра сябе, пра свайго брата і яшчэ кольких людзей, што трапілі ў фокус яго асабістага жыцця. Праз тое асабістае ў падтэксце аўтарскага апавядання ўгадваецца шырокае дыханне сацыяльнага быцця грамадства. Аўтар у дадзеным выпадку выступае не толькі як «рэстаўратар» фактаў даўняга мінулага. Ён праз яркія, часам вельмі скупыя, але ёмістыя думкамі дэталі раскрывае, як бы агаляе сутнасць свайго часу. Напісаная пра асабістае, кніжка высвятляе заканамернасці, характэрнасці грамадскага жыцця пярэдадня рэвалюцыі і першых яе год. Возьмем хоць бы раздзел «Пастушкі». У нашай літаратуры, асабліва маладнякоўскага перыяду, нямала напісана пра пастушкоў. У многіх біяграфіях маладога перадрэвалюцыйнага пакалення, у яго анкетах пісалася: «з пастухоў». Нават у свой час выходзіла ў нас на Беларусі спецыяльная газета «Батрак Беларусі». Яна была як трыбуна, з якой выступала пакрыўджанае і зганьбаванае старым часам юнацтва. У асноўным гэта была сялянская беднатa, перад якой Кастрычнік адкрыў дарогі ў свет новага жыцця. Сяргейчык у сваёй кніжцы здолеў зірнуць на такую распаўсюджаную з'яву, як батрацтва, з вышыні нашага часу і паказаць яго праўдзіва, вельмі ярка. Думаецца, што сучасная моладзь, чытаючы гэтыя старонкі, знойдзе для сябе шмат карыснага.

Няма чаго і казаць: маладыя людзі, якія ідуць сёння ў мастацтва, будуць не толькі здзіўлены тым, як і якімі дарогамі ішлі старэйшыя майстры, сённяшнія іх паплечнікі, да сваіх творчых мэт. Аднаго здзіўлення мала. Можа хоць на момант яны здолеюць глыбей працяцца той адказнасцю, якая на іх ускладаецца нялёгкай прафесіяй. Тое, што чалавеку нялёгка даецца, заўсёды больш цэніцца, чым тое, што ляжыць на дарозе. Я гэтым не хачу сказаць, што чалавеку да здзяйснення сваёй мэты трэба заўсёды ісці праз нейкі лабірынт пакут. Але я хачу сказаць, што яму абавязкова, калі ён хоча быць сапраўдным майстрам, больш таго мастаком, у той галіне да якой ірвецца яго сэрца, трэба паперша, унікаць лёгкасці ў выбары прафесіі, а, па-другое, ніколі не трэба шкадаваць ні сіл, ні энергіі, дамагаючыся дасягнення той мэты, якая перад ім свеціцца, як зазыўны маяк. Пошукі для чалавека, не зважаючы, у якой галіне ён дзейнічае, гэта абавязковая ўмова яго поспеху, асабліва ў творчасці. Без пошукаў няма і не можа быць знаходак, а без знаходак не можа быць сапраўднай творчасці.

Адна з дадатнасцей кніжкі Цімоха Сяргейчыка ў тым, што яна ад першай да апошняй старонкі працята імкненнем гэтых пошукаў, іх прапаведдзю. І галоўнае, што гэта імкненне чытаецца не як асабістае, а як агульная характэрнасць нашага савецкага чалавека. І хоць аўтар, відаць, не ставіў перад сабою мэты паказаць час у яго гістарычнай паслядоўнасці і абумоўленасці — ён спакойна расказвае пра сябе і пра блізкіх яму людзей, — але адчуваеш, што гэтае апавяданне вядзецца на быстрацечнай плыні часу, што жыццё, пра якое апавядаецца, вельмі канкрэтна і выразна прывязваецца да пэўных гістарычных перыядаў.

У кнізе Цімоха Сяргейчыка два раздзелы — «Малюнкі з мінулага» і другі — «На прафесіянальнай сцэне». Першы як бы паказвае тое асяроддзе, у якім узышоў чалавечы талент. Праўда, нельга сказаць, каб асяроддзе было вельмі спрыяльнае. Наадварот. І таму парастак таленту ўспрымаецца, як тая магутная сіла, жывы струмень народнага жыцця, які ў імя гэтага жыцця крышыць камені і прабіваецца на волю, да сонца.

І от парастак прабіўся да сонца. І другі раздзел, названы, можа, занадта празаічна і прыктычна, апавядае пра тое, як гэты парастак вылюдзеў, скрышыў усе нягоды і выбіўся да сонца. Калі чытаеш старонкі, у якіх расказваецца пра рэпетыцыі на сцэне, пра спектаклі, цябе не пакідае адчуванне нейкай унутранай трывогі, якая не дае Сяргейчыку, які ўжо знайшоў сябе на сцэне як творца прыгожага, спакойна перажоўваць здабытае і задавальняцца яго смакам. Але гэтая трывога не ад безнадзейнасці, а менавіта ад вялікай надзеі на тое, што можна і трэба дамагацца лепшага. Гэта трывога творчая, заўсёдная, і калі б яна пакінула чалавека, наўрад ці стаў бы ён мастаком, наўрад ці здолеў бы ён чаго дамагчыся.

У другім раздзеле за творчым аблічам аднаго мастака выразна чытаецца творчае крэда ўсяго калектыву, да якога належыць аўтар, як адна з вельмі характэрных адзінак яго. Прачытайце хоць бы старонкі пра тое, як ставіўся адзін з лепшых нашых нацыянальных спектакляў «Несцерка», і вы пераканаецеся, якая нялёгкая і пачэсная місія тэатра — хавальніка традыцый народнага жыцця, яго духоўнай сілы, яго крыніцы думак і пачуццяў.

Няма чаго казаць: часам у нас не дужа далёкія людзі глядзяць на тэатр, як на забаву. Ім здаецца, што не гэтак ужо і цяжка выйсці на сцэну і пакрыўляцца перад людзьмі якую гадзіну ці трошкі больш. Таму, хто так па-дылетанцку думае, я параіў бы прачытаць у кнізе пра тое, як тэатр імя Якуба Коласа ставіў п'есу Ул. Ільянкова «Плошча кветак». П'еса Ільянкова не была шэдэўрам драматургіі. Галоўны персанаж яе Сяргей Пятровіч Кашырын з першага чытання выглядаў далёка не героем. Але адкуль жа ў яго знайшлася сіла на глыбока патрыятычны ўчынак у барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі? У п'есе гэта было не зусім пераканальна. А п'есу ставіць трэба было — яна ўслаўляла патрыятызм савецкага народа. Тэма яе ў той час барацьбы з фашызмам вунь як была патрэбна. Роля Кашырына была даручана Сяргейчыку. І вось пачаліся бяссонныя ночы думання і перадумвання жыцця Кашырына. Сяргейчык як творца выдумаў біяграфію героя, і калі ў гэтым выдумванні знайшоў лагічную нітку развіцця яго, тады мастацкія сцэнічныя дэталі пачалі класціся на выяўленне канкрэтнага чалавечага характару. Вобраз атрымаўся. А следам за галоўным вобразам пачаў фармавацца і цалкам увесь арганізм спектакля, выразней выяўляцца яго ідэйная задума ўслаўлення патрыятызму савецкага чалавека. Спектакль, як кажуць, прагучаў. А ў іншых жа тэатрах, якія тады былі ўзяліся за п'есу «Плошча кветак», ён гэтак і не пабачыў святла рампы. Значыць, калі кажуць, што поспех спектакля тоіцца ў драматургічным матэрыяле, гэта такі так, але гэта яшчэ не ўся праўда: поспех спектакля залежыць і ад рэжысёрскай і акцёрскай трактоўкі яе ідэі, яе вобразаў. Без дакладнага і глыбокага прачытання п'есы не можа быць паўнацэннага спектакля нават на добрай драматургічнай аснове. Аб усім гэтым пераканаўча расказвае Цімох Сяргейчык.

У кнізе Сяргейчыка пра многае можна прачытаць. Прачытаць з карысцю для сябе, для пазнання крыніц нашага роднага беларускага мастацтва, перад якім адкрыў дарогу Вялікі Кастрычнік. Але мне хочацца звярнуць увагу чытача на тое, што гэтая кніга, нібы тая першая ластаўка, пра якую кажуць, што хоць яна і не робіць вясны, але яна вястун гэтае вясны, бо за ёй прыляцяць іншыя. Хацелася б, каб майстры нашага мастацтва, наследуючы прыклад свайго сабрата, расказалі пра свае шляхі. Гэта спатрэбілася б не адным толькі маладым пакаленням яго, але і ўзняло б, паказала б ролю нашага нацыянальнага мастацтва як важнейшага чынніка ў камуністычным выхаванні народа.

Колькі слоў пра майстэрства Цімоха Сяргейчыка не як акцёра, а як літаратара. Сяргейчык можа ляпіць не толькі сцэнічны вобраз сродкамі акцёрскага мастацтва. Ён умее рэльефна, як і на сцэне, ляпіць вобраз сродкамі мовы. Для мяне, напрыклад, нечаканым было тое, як аўтар намаляваў вобраз выдатнага нашага пісьменніка Кузьмы Чорнага. Ва ўсякім разе я ўгледзеў на старонках кнігі жывога Кузьму Чорнага, з яго крывёй і плоццю. А для гэтага трэба, відаць, мець талент, каб гэтак маляваць словамі.

Я не кажу, што кніга Ц. Сяргейчыка бездакорная ва ўсіх адносінах. У ёй часам адчуваецца эскізнасць, часам ёй не хапае шырокага дыхання, часам у ёй і моўная палітра не гэтак багатая, якою б яе хацелася бачыць. Але ж гэта першая спроба, і калі яна ў нечым і не зусім дакладная, дык трэба аўтару дараваць. Хацелася б аднаго, каб гэтая спроба не засталася першай і апошняй, каб яна знайшла свой плённы працяг. Тым больш, што ў аўтара ёсць усе для таго, каб паявілася другая, а мо і трэцяя кніжкі.

Пажадаем жа яму поспеху.

Раман САБАЛЕНКА.

Ц. Сяргейчык. Нататкі акцёра. Шлях жыцця і творчасці. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Васіль БЫКАЎ. Франтавыя старонкі. Аповесці. На рускай мове. Мастакі В Дзяменцьеў і Е. Ігнацьеў. 1966 г. Тыраж 100 тыс. экз. 456 стар. Цана 84 кап.

Мікола ВАДАНОСАЎ. Пабярэжжы. Аповесць. На рускай мове. Мастак А. Дэмарын. 1966 г. Тыраж 100 тыс. экз., 184 стар. Цана 18 кап.

Рыгор КОБЕЦ. Піражкі з чырвонцамі. Аднаактовая п'еса. У рэпертуар мастацкай самадзейнасці. Мастак І. Бялецкі. 1966 г. Тыраж 7 тыс. экз., 32 стар. Цана 5 кап.

Яўген КУРТО. Над ярам. Аповесць. 1966 г. Тыраж 14 тыс. экз., 72 стар. Цана 11 кап.

Аляксандр ПЕТРАШКЕВІЧ. Кары егіпецкія. Аднаактовая п'еса. У рэпертуар мастацкай самадзейнасці. Мастак І. Бялецкі. 1966 г. Тыраж 7 тыс. экз., 36 стар. Цана 6 кап.

Барыс САЧАНКА. Пакуль не развіднела. Аповесці і апавяданні. Мастак М. Бельскі. 1966 г. Тыраж 8 тыс. экз., 340 стар. Цана 48 кап.

ПАЭТЫЧНАЯ ПАВЕРКА

Алег ЛОЙКА

ЛЯ СІВЫХ ГРАДЧАН

Вясну гэтага года мне пашчасціла сустракаць у братняй Чэхаславацкай рэспубліцы, у залатой Празе і над Дунаем у Браціславе. Там зарадзіліся вершы, якія сёння прапаную ўвазе чытачоў.

АЎТАР

Zlatý dešť

Zlatý dešť — гэта сонца лівень,
Пырскі яркія на кустах,
Кожны куст, як дзівосны птах,
Іх трымае ўрачыста, шчасліва.

А ён льецца, звініць, пяе!..
Пі яго ад любое смагі,
Пазнавай залатую Прагу —
Думы, песні, людзей яе!..

Дождж не золата — кветак дождж,
Захапленне маё бурштыновае,
Ручаіны з Градчан вясновыя,
Расспяваныя, як маладосць.

Зіхаці, як жыццё, жаданы,
Мірна плёскай пад кожным акном!..
Вам навечна ў сябры, пражане,
Я хрысціўся гэтым дажджом.

Zlatý dešť (чэшск.) — залаты дождж.

СІНІ ДУНАЙ

Ляцелі гусі
З Белае Русі.
Селі яны, палі
На сінім Дунаі...
(З беларускай народнай песні)

Дык сіні ты
ці не сіні?..
Гляджу я
ў твае глыбіні,
гляджу
ў твае рыжыя тоні:
зара ў іх паціху тоне
(а, можа, на грэбнях хваль
сплывае за мост — удаль?).
Дзяўчаты на парапеце
сядзяць летуценна,
а дзеці
над самым, самюткім Дунаем
зацята ў футбол
гуляюць.
У ззянні рэклам камяніцы —
брамы, байніцы, парталы, —
званілі мячамі тут
рыцары,
што кроўю Дунай залівалі,
а ў сорак чацвёртым канале
паўстанцы.
Гонкія хвалі
веюць барвовай стынню...
Дык сіні ты
ці не сіні?..
Славачкі, быццам багіні,
сілуэтамі ў небе сінім,
сілуэтамі горы, абрывы,
дрэваў сінія грывы, —
бераг у цемрыве гіне...
Дык сіні ты
ці не сіні?..
Я над табой блукаю,
гусей з Белай Русі шукаю.
І чую зноў: маці спявае
аб сінім, любым Дунаю...
Сіні... Сіні... Сіні...
Быў сіні і будзеш заўсёды...
Зоры ў ціхіх глыбінях,
плылі, як гусей чароды.

СКАРЫНА — КАРАЛЕЎСКІ САДОЎНІК НА ГРАДЧАНАХ

Ён тут хадзіў, і ліпы векавыя,
Што сёння навісаюць нада мной,
Мо праўнукі сцяблінак тых, якія
Ён пасадзіў уласнаю рукой.

Адсюль, з Градчан, ён, пэўна, па-за Влтаву
Не раз на поўнач любую глядзеў:
То пах туман наддзвінскаю атавай,
То цвіў чаромхай воблак у вадзе.
Бароў далёкіх мроіўся сон сіні,
Спеў жаўранка, віроў і пчолаў гуд.
Сафійка і царкоўка Ефрасінні,
Бацькоўскай пяцісценкі родны кут.

Глядзеў на Влтаву — на віры і тамы,
А ўспамінаў пра іншыя віры,
Пра гнёзды, птушкам любыя, пра ямы,
Што любяць у пустынях нат звяры.

І трэба ж так!.. Ці ж не народу, краю
Аддаў ён і сябе, і кніг тамы,
Завошта ж лёс бязлітасна карае
Пажарамі і холадам турмы?..

Сябры ці не сябры вы — Бабіч, Онкаў?..
Я ж быў бы з вамі, каб хацелі вы,
І не заморскаю тразой — рамонкам
Лячыў бы, можа, лепш любой травы.

Садоўнік каралеўскі, муж славуты,
Доктар мастацкіх, лекарскіх навук,
Я б тут не замарудзіў ні мінуты,
Зноў не змываў бы фарб друкарскіх з рук.

Паклічце, не дамо мы езуітам
Кніг спальваць, ганьбіць мовы нашай гук,
Дабра жадае людзям паспалітым
Доктар мастацкіх, лекарскіх навук..

Заморскіх траў, кустоў і кветак нетры...
Аб мур Градчан абпёршыся спіной,
Туды ўсё. ён глядзеў, дзе немым ветразем
Сафійка красавала над Дзвіной...

АБ ШЧАСЦІ

Дзяды-земляробы пра шчасце
Вельмі па-простаму мыслілі:
Каб хлеба — не як прычасця,
Каб скварка штодня ў місе,
Зямлі каб яшчэ паўгектара
І каб не смярдзела панам...
Здзяйсненая іхняя мара
Плыве, як поўня, заспана.
А мы зноў гаворым пра шчасце:
Няўжо земляроб мыліўся,
Прагнучы не як прычасця
Хлеба і скваркі ў місе?..
Маладзіком вясновым
Праразаюцца мары нанова, —
У чым жа яно — тое слова,
Каб шчасцем назваць канчаткова?..
А мо слоў шукаць не варта,
Працуй, мару кожную споўні,
Ведаючы: з кожнай квадрай
Месяц ідзе да поўні!..

ТУТ, ДЗЕ ЦВІТУЦЬ АБРЫКОСЫ

Тут, дзе цвітуць абрыкосы,
Я памерці гатоў,
Каб
у ружовым плёсе
Іх квету
сніць пра любоў.

Расчэша славачка косы
На руках у кагось,
Асыплюць на іх абрыкосы
Пялёсткаў ласкавы плёс,

А мне ўсё будзе здавацца:
Лятуць яны на мяне,
І буду ўсміхацца славачцы
Ў непрабуджальным сне.

А вельмі ўжо крыўдна стане,
Шлях да яе знайду:
Абрыкосам ўзыйду на кургане,
Пялёсткам на рукі ўпаду...

СВЯТА НАД ДНЯПРОМ

Абодва калгасы носяць імя Тэльмана. Адзін знаходзіцца ў Брагінскім раёне Беларусі, а другі — у Рэпкінскім, на Украіне, за Дняпром. Беларускія і ўкраінскія калгаснікі пасябравалі яшчэ ў гады партызанскай барацьбы. А пасля вайны пачалося спаборніцтва ў працы. Стала традыцыяй у канцы лета сумесна адзначаць Свята ўраджаю.

Вось і нядаўна моладзь абодвух калгасаў сабралася на ўкраінскім беразе Дняпра, у прыгожым бярэзніку Стрэліца.

Пасля ўрачыстай часткі адбыўся вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці. У ім прыняў удзел беларускі чытальнік, заслужаны дзеяч культуры БССР Аляксей Слесарэнка.

ТЭАТР ЗНАХОДЗІЦЬ НОВЫ СІНТЭЗ

Тамара Грум-Гржымайла,
мастацтвазнаўца

Тэатр спакон веку быў прыстанішчам усіх мастацтваў і аж да з'яўлення кінематографа захоўваў прэрагатыву іх высокага сінтэзу. Што ж цяпер? Драма і пантаміма, музыка і харэаграфія, жывапіс, пластыка, светладэкаратыўныя сродкі — усё гэта па-ранейшаму жыве ў рамках «старой» сцэнічнай каробкі, але ўступае ўжо ў нейкі іншы, складаны сінтэз. Іншы, але, можа, не новы?

У мастацтве новае складае нікчэмна малы працэнт побач з вялікім мноствам пераймальнага, традыцыйнага. Да таго ж новае часам толькі «прыкідваецца» новым, перажываючы на самай справе другое або трэцяе нараджэнне пасля стадыі мастацкага «анабіёзу», часовай кансервацыі.

Мы памятаем, як узрывалі «праклятую сцэнічную каробку» Меерхольд і Маякоўскі ў пошуках відовішчнасці, плакатнасці, сімвалічнай умоўнасці паказу, сціраючы грані паміж тэатрам і публіцыстычнай трыбунай, тэатрам і эстрадна-цыркавой пантамімай. «Мы разлагалі, разбуралі стары тэатр, — пісаў Меерхольд, — але ў галаве трымалі формулу сінтэзу. Каб прыйсці да прастаты, што вырасла на базе гэтых пошукаў, прыйсці да сінтэзу, патрэбна была антытэза».

І сапраўды, «антытэза» тэатральных рэформ 20-х гадоў дала перспектыву сінтэзу ў наш час. У пастаноўках гістарычных і бытавых драм, камедый, нават опер апошніх год усё часцей прыжыўляюцца (перажываючы другое-трэцяе нараджэнне) тыя самыя элементы ўмоўна-іграваой стыхіі, пантамімы, эксцэнтрыкі, эстрадна-канцэртнага стылю, якія ўзрывалі стары тэатр у эпоху рэвалюцыі і якія сёння даюць багатую дадатковую палітру рэалізму.

Толькі два прыклады. У новай пастаноўцы Цэнтральнага тэатра Савецкай Арміі «Смерць Іаана Грознага» па п'есе А. К. Талстога з дапамогай цыркавой эксцэнтрыкі і танцавальна-акрабатычнай пантамімы рэжысёр Леанід Хейфіц дасягае выдатнага сімвалу. Гэтыя шалёна-глумлівыя акрабатычныя танцы скамарохаў над целам ужо нежывога цара і асабліва фінальны выхад на руках з растапырынымі ўверсе нагамі царскага блазна (яго выконвае цыркавы артыст) — цюцелька ў цюцельку выхад фігуры абезгалоўленага, босага чалавека ў чырвонай рвані — ці не ёсць гэта трагічны сімвал рускай гісторыі, гісторыі народа і крывавых цароў?! Тут украпванне цыркавога труку ў стрыманы, рэалістычны стыль размоўнай драмы дало асляпляльны эфект.

Зусім іншы прыклад: Пак — клапатлівы, спрытны, вясёлы дух лесу — у оперы Бенджаміна Брытэна «Сон ў летнюю ноч», пастаўленай у мінулым сезоне Вялікім тэатрам. Як ён куляецца па лесе, пералятае паміж дрэвамі, балбоча, выкрыквае свае рэплікі сярод томных арый Аберона і Тытаніі і крышталёвых хораў маленькіх эльфаў? Цыркавы, эстрадны артыст у оперы! Хіба гэта не навіна, хіба гэта не парадокс?

Але, магчыма, парадаксальнасць іменна ў тым, што гэты цыркавы эксперымент унёс у высокую ўмоўнасць опернага жанру не дух казачна-фантастычнай умоўнасці, але элементы жыццёвасці, рэалізму.

Калі з'явіўся «вялікі нямы» — дзецішча XX стагоддзя кінамастацтва, — ён увабраў у сябе вопыт і сродкі драмы, пантамімы, оперы і балета, цырка, выяўленчых мастацтваў — і ўсё гэта арганізаваў па-іншаму. Зрушыліся, разняволіліся ўяўленні прасторы і часу аб жыцці, адлюстраваным у мастацтве. Са з'яўленнем гукавых фільмаў іншым стаў рытм дзеяння, сэнсавая роля музычнага фону. Гукавы рад фільма, у якім перапляліся эмацыянальная вобразнасць чалавечай мовы, шумавая сімволіка жыцця і музычна-рытмічныя характарыстыкі, стаў новым элементам драматургіі. І не толькі ў кіно. Прынцыпы «гукавой партытуры» фільма ўвараліся ў драматычны тэатр.

Яшчэ Меерхольд у сваёй пастаноўцы «Рэвізора», увёўшы музычнае суправаджэнне, спрабаваў падпарадкаваць дзеянне музычным рытмам. Гэтая цікавая спроба мела, магчыма, эксперыментальнае значэнне якраз таму, што перад вачыма рэжысёра быў толькі вопыт оперы і балета і не хапала практыкі гукавога кіно. Аналізуючы гэтую работу Меерхольда, А. В. Луначарскі ў тыя гады пісаў: «Я павінен сказаць, што даўно ўжо марыў, ды і гаварыў аб падпарадкаванні драмы, з яе, так сказаць, абывацельскай рыхласцю, стройным рытмам, якія панавалі ў оперы і асабліва ў балеце... Драму, здавалася мне, у нейкай асцярожнай меры неабходна рытмізаваць».

І вось сёння мы назіраем, як усё гэта становіцца дасягненнем. Мы назіраем, як у «старой», «праклятай» сцэнічнай каробцы побач з «адроджанымі» элементамі складваецца новы сінтэз драмы, музыкі і кіно, як адбываецца «мантаж» і «рытмізацыя» п'ес па прынцыпах кінадраматургіі.

Пра адзін характэрны спектакль (пастаўлены кінарэжысёрам!) хочацца расказаць больш падрабязна.

Сцены чорнай сцэнічнай каробкі глядзяць трыма гіганцкімі фатаграфіямі дзеючых асоб. Заслоны няма. Дэкарацый няма.

Мы ў тэатры на Таганцы, якім кіруе Юрый Любімаў, дзе прывычныя ўяўленні прасторы і часу ссунуты, як у кіно. Прадметы і з'явы часам «скарочаны» да элементаў.

У кутку, на светлы квадрат падлогі кінута яловая галінка — гэта хутка стане тайгой, па якой напорыстым крокам пройдзе (не зрушыўшыся з месца!) Маша Полазава — малады вучоны аднаго з маскоўскіх інстытутаў. Злева на авансцэне крэсла і стол з тэлефонамі — дэталі маскоўскага кабінета, дзе будзе «ўдалечыні» (і ў двух кроках!) ад Машы трывожыцца пра яе лёс дырэктар інстытута прафесар Губін. А вось і «стойбішча» яго маральнага праціўніка ў барацьбе за Машу: там, у правым кутку авансцэны, вісіць цёплая куртка, стаяць унты, крэсла і несамавітая незгаральная шафка, дзверцамі якой не раз упарта лясне рыжабароды, «незнішчальны» начальнік Якуцкай экспедыцыі — Ілья Бондараў.

Вось і ўся абстаноўка ў спектаклі «Толькі тэлеграмы», пастаўленым па п'есе Валерыя Осіпава рэжысёрам Тэадорам Вульфовічам. Зрэшты, не. У цэнтры аркестравай «ямы» — вытыркнутая над сцэнай рацыя, якая сустракае гледача галасамі эфіру, як толькі ён ступае ў залу. Ад рацыі не адыдзе радыстка, якая і аб'явіць, што п'есы ўвогуле не будзе, будуць толькі тэлеграмы, якія пасылалі адзін аднаму гэтыя трое, што глядзяць з фотаздымка, а прачытаюць тэлеграмы артысты тэатра — Зінаіда Славіна, Аляксандр Калягін і Анатоль Васільеў.

Так узнікае прадпасылка «чытаць на публіку», як з канцэртнай эстрады, ствараецца своеасаблівы стыль — стыль лірычнай публіцыстыкі. Так узнікае прадпасылка стварыць рытм спектакля незалежна ад «абывацельскай рыхласці» дзеяння. І кадр за кадрам, як тэлеграфны «штрых-пункцір», паляцяць у глядзельную залу паведамленні аб думках і дзеяннях герояў, і ў гэтым імклівым рытме глядач не заўважае пераходу ад інфармацыі да паказу, ад паказу да перажывання.

Свабоднае чаргаванне «інфармацыйных» і ігравых эпізодаў, іх своеасаблівы «кінамантаж» на тэатральнай сцэне былі б, бадай, драматургічна непераканаўчыя, калі б не была цікава распрацавана рэжысёрам «гукавая партытура» спектакля. Сюды ўваходзіць усё: марзянка, настройка рацыі, «выпадковыя» ўрыўкі з эфіру, гул самалёта, брэх сабак, стук дзверцаў шафы Бондарава і «ўдары» аплявых і, нарэшце, арыгінальныя, рытмічна вострыя музычныя застаўкі, напісаныя для спектакля кампазітарам Соф'яй Губайдулінай.

І ў гэтай няспынна «падагграваемай» дынамічнай музычнай стыхіі свабодна жыве фантазія рэжысёра, выклікаючы да жыцця «дадатковую палітру» сродкаў — пантаміму, эксцэнтрыку, харэаграфію, светлавыя эфекты, якія расстаўляюць сэнсавыя акцэнты.

Іншае пытанне — дзе ж выкарыстанне гэтых прыёмаў сапраўды добрае, а дзе выглядае прэтэнцыёзна, перарастае ў самамэту. Думаецца, у цікавай, багатай новымі эксперыментамі рабоце Тэадора Вульфовіча і групы таленавітых маладых акцёраў Таганскага тэатра галоўная мэта апраўдвала абраныя сродкі. А мэта была — палымянае выкрыццё жорсткасці і ўладалюбства ілжэгерояў, дзялкоў, надзеленых адказнымі паўнамоцтвамі, — устанаўленне ідэалаў сапраўды чалавечых, сумленных адносін паміж людзьмі. Такая мэта патрабавала сродкаў, дакладных, імклівых, рэзкіх, асацыятыўных.

Няма сумнення ў тым, што пошукі новага сінтэзу мастацтваў, якія ідуць на савецкай тэатральнай сцэне ў розных жанрах, звязаны перш за ўсё з пошукамі публіцыстычна вострых, відовішчна-забаўляльных і высокамастацкіх вырашэнняў важных сучасных праблем.

АДН.

ТРЫВОГІ АНГЛІЙСКАЙ КІНЕМАТАГРАФІІ

У той час як англійскія фільмы атрымліваюць усё большае прызнанне збоку крытыкі, англійская кінапрамысловасць адчувае сябе ўсё менш упэўнена з фінансавага пункту гледжання.

Уся справа ў тым, што англійская кінематаграфія ўсё ў большай і большай ступені трапляе ў залежнасць ад амерыканскіх грошай, так што, калі Злучаныя Штаты раптам вырашаць забраць свае капіталы, англійская кінапрамысловасць проста разваліцца. Іменна пра гэта гаворыцца ў чарговай штогадовай справаздачы «Нэшнл філм файнэнс карпарэйшн». Летась, сказана ў справаздачы, здымка дзвюх трэціх усіх поўнаметражных мастацкіх фільмаў у Англіі цалкам або часткова фінансавалася амерыканскімі кампаніямі. Маштабы такога фінансавання працягваюць расці.

Кіраўнік «Нэшнл філм файнэнс карпарэйшн» Джон Тэры, выступаючы ў Лондане на прэс-канферэнцыі, у ходзе якой была абвешчана справаздача, заявіў, што карпарацыя адчувае «выключныя цяжкасці» ў справе атрымання грошай ад англійскіх банкаў і што можна гаварыць пра рызыку поўнага краху, калі амерыканцы раптам вырашаць пазбавіць англійскую кінематаграфію сваёй фінансавай падтрымкі. А галоўнае, на думку Тэры, «такі сродак уздзеяння на масы, як кіно, якое валодае велізарнай псіхалагічнай сілай, нельга цалкам ставіць пад кантроль уплываў са зне».

У рэдакцыйным артыкуле, прысвечаным справаздачы «Нэшнл філм файнэнс карпарэйшн», газета «Дэйлі тэлеграф» звяртаецца да ўрада з заклікам аказаць вялікую дапамогу англійскім кінапрадзюсерам, падтрымаўшы айчынную вытворчасць фільмаў і прыняўшы меры з мэтай пакласці канец сённяшняму манапольнаму кантролю збоку кінапракату. Справа ў тым, што пракатныя фірмы схільныя закупляць занадта многа замежных (галоўным чынам амерыканскіх) фільмаў.

Пэт ГРЭГАРЫ,
карэспандэнт ТАСС.

Лондан.

Верасняўскі ЭКРАН

У верасні на экраны рэспублікі выходзіць шыроказкранная мастацкая кінаапавесць «Ніхто не хацеў паміраць», створаная рэжысёрам Вітаўтасам Жалакявічусам на Літоўскай кінастудыі па ўласным сцэнарыі.

На Усесаюзным кінафестывалі ў Кіеве фільму «Ніхто не хацеў паміраць» прысуджана першая прэмія. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр-пастаноўшчык карціны Вітаўтас Жалакявічус удастоены ў гэтым годзе таксама прэміі Ленінскага камсамола, а акцёр Данатас Банёніс, які зняўся ў ролі старшыні сельсавета, атрымаў спецыяльны прыз за лепшую мужчынскую ролю на XV Міжнародным кінафестывалі ў Карлавых Варах.

На экранах рэспублікі будзе дэманстравацца новая работа беларускіх кінематаграфістаў — шыракаэкранная мастацкая кінаапавесць «Альпійская балада», пастаўленая рэжысёрам Барысам Сцяпанавым па аднайменнай аповесці Васіля Быкава.

У галоўных ролях заняты акцёры Любоў Румянцава і Станіслаў Любшын. Здымаў фільм малады аператар Анатоль Забалоцкі.

На вераснёўскім экране — двухсерыйная мастацкая кінастужка «Сябры і час», створаная рэжысёрам Віктарам Сакаловым на кінастудыі «Ленфільм» па матывах аднайменнай п'есы Леаніда Зорына.

Гісторыя цэлага пакалення нашых сучаснікаў паказваецца ў фільме праз лёс людзей, для якіх рамантычныя дзіцячыя летуценні аб шчасці сталі стартам на цяжкім жыццёвым шляху. Не ўсе вытрымалі выпрабаванні вайны, горыч страт і разлук. Адны замкнуліся ў вузкім свеце асабістага дабрабыту, для другіх уяўленне аб шчасці пачало асацыіравацца з імклівай кар'ерай. Але сапраўдным героем кінаапавядання стаў чалавек, які застаўся верны высокім ідэалам барацьбіта-камуніста.

Галоўныя ролі выконваюць Аляксандр Граве, Юрый Якаўлеў, Алег Анофрыеў, Зіновій Высакоўскі, Ніна Весялоўская, Наталля Вялічка.

Новую мастацкую карціну «Клятва Гіпакрата» выпускае на экраны Рыжская кінастудыя. Аўтар сцэнарыя — Яўсей Баранбойм, рэжысёр-пастаноўшчык — Ада Нерэтніцэ. Фільм апавядае пра глыбокі, сур'ёзны падыход да сваёй прафесіі, пра адказнасць перад грамадствам, пра каханне і дружбу, чалавечую чуласць.

У верасні гледачы ўбачаць таксама новую каляровую кінастужку «Падарожнік з багажом», створаную на Маскоўскай кінастудыі імя М. Горкага паводле сцэнарыя Уладзіміра Жалезнікава.

— Наш фільм, — гаворыць рэжысёр Ілья Фрэз, — ўяўляецца своеасаблівым працягам сур'ёзнай размовы, пачатай у кінакарціне «Я купіў тату». Але гэта толькі другі бок той жа праблемы — аб адказнасці дарослых за лёс дзяцей. Герой фільма «Я купіў тату» пяцігадовы Дзімка ўбачыў ідэал бацькі ў манекене, выстаўленым у вітрыне універмага. А для Сеўкі, сумленнага, шчырага, прынцыповага хлопчыка, раўнадушны хвалько і пусты чалавек не можа служыць ідэалам сапраўднага бацькі. Сеўку акружаюць добрыя і чулыя людзі, і ён сам стане такім.

Мы лічым, што з дзецьмі можна і трэба размаўляць сур'ёзна пра самае важнае ў жыцці, не стараючы ў іх ілжывых ілюзій.

Наш фільм задуманы як камедыя. Мы імкнуліся ўбачыць смешнае ў трагічным, паказаць, як забаўнае і сумнае лёгка ўжываюцца побач, калі свет, які ўяўляецца дзіцяці, часта не адпавядае рэчаіснасці.

Акрамя Валодзі Косціна і Віці Клімава, у карціне здымаліся Л. Хіцяева, М. Пугаўкін, В. Аўдзюшка, В. Землянікін.

З зарубежных кінастужак у верасні будуць дэманстравацца: «Малады баец» (ДРВ), «Дазвол на шлюб» (Балгарыя), «Старыя на ўборцы хмелю» (Чэхаславакія), «Галасую за любоў» (Югаславія), «Апавяданні пра дзяцей» (Чэхаславакія), «Прыгоды настаўніцы» (Фінляндыя), «Пяцёра пад зямлёю» (Японія), «Зацьменне» (Італія — Францыя), «Малютка Чэрвен, Боцман і Мозес» (Швецыя).

Кадр з фільма «Падарожнік з багажом».

Кадр з фільма «Сябры і час».



Кадр з фільма «Альпійская балада».

Куток калекцыянера

ШТО ТАКОЕ ЭРЫНАФІЛІЯ?

Філатэлісты, філакартысты, філуменісты, баністы, нумізматы... Да гэтых слоў аматары збіральніцтва ўжо прывыклі, а вось пра эрынафілістаў наўрад ці чуў адзін чалавек з тысячы. А між тым эрынафілія — адна з цікавейшых галін калекцыяніравання.

У Савецкім Саюзе эрынафілістаў пакуль што вельмі мала. А ўлічаных таварыствамі калекцыянераў — адзінкі. Найбольш вядомыя сярод іх Міхаіл Няронаў, Барыс Яніцкі і Уладзімір Бабарыцкі. Эрынафілія — збіранне ўсялякіх памятных, юбілейных, рэкламных, дабрачынных марак, этыкетак, ярлыкоў, запрашальных білетаў, наклеек.

У зборах эрынафілістаў ёсць унікальныя рэчы. Напрыклад, марка з партрэтам Карла Маркса, выпушчаная за граніцай партыяй бальшавікоў. Маркі гэтыя ўручаліся тым, хто ахвяраваў пэўную суму на выбарчую кампанію бальшавікоў у IV Думу.

Рэдкімі з'яўляюцца дабрачынныя маркі, выпушчаныя ў Расіі ў 1912—13 гг. на карысць развіцця айчыннай авіяцыі, жэтоны збораў на карысць параненых першай сусветнай вайны, маркі, якія распаўсюджваліся ў Расійскай Федэрацыі на карысць галадаючага насельніцтва Паволжа. А колькі такіх выданняў ажыццяўлялася на месцах! Напрыклад, у маі 1924 года ў Ноўгарадзе быў наладжаны «Дзень лесу». Правялі збор на новыя лесанасаджэнні. Кожнаму ахвяравальніку выдалі марку з малюнкам камсамольца з чырвоным сцягам у руцэ, які ўступае ў лес. Памяталі, улічвалі, збіралі такія маркі толькі эрынафілісты.

Здавалася б, навошта хаваць дабрачынныя маркі і этыкеткі? А між тым гэта каштоўны дадатковы дапаможнік для гісторыкаў, неабходная рэч для кінематаграфістаў, якія ўзнаўляюць у фільмах блізкае і далёкае мінулае.

Як вядома, дзякуючы цукерачным паперкам, якія захоўваліся ў калекцыянераў, удалося ўстанавіць і ўключыць у збор твораў Маякоўскага шмат рэкламных вершаў паэта, напісаных ім для кандытарскіх фабрык. Вялікую гістарычную каштоўнасць маюць дэлегацкія мандаты і гасцявыя білеты на з'езды партыі, кангрэсы Камінтэрна, народныя ўрачыстасці...

Калекцыя Міхаіла Няронава вельмі цікавая. Ён збірае ўсё, што звязана з памяццю Ул. І. Леніна. Уладзімір Бабарыцкі захоплены касмічнай тэматыкай, а Барыс Яніцкі — больш універсальны. У яго калекцыі тое, што, на яго думку, мае гістарычную цікавасць.

Уладзімір БАГДАНАЎ
(АДН).

«ШАНАТ ПАВАЖАНАЯ таварыш Ібаруры! Прашу прабачыць мяне за тое, што сваім пісьмом закрануў мацярынскую рану, якая ніколі не загойваецца. Я прачытаў кнігу пра Вашага сына. Яго кароткае, але яркае жыццё мяне глыбока ўсхвалявала, і я вырашыў напісаць яго партрэт, каб мужны вобраз Рубена заўсёды быў перада мною, каб кожную раніцу я мог прачынацца разам з ім. Мой пэндзаль — як аўтамат для Рубена, і колькі ёсць у мяне сіл, я буду змагацца за жыццё...»

Гэтыя радкі напісаны рукой шаснаццацігадовага Сашы Курчанкі з украінскага горада Чарнобылі. Вось ужо чатыры гады ён прыкуты да ложка цяжкай хваробай. Але бяда не зламала юнака. Ён поўны энергіі, нястрымнай хлапечай цікаўнасці і творчага гарэння.

Так, іменна творчага. Саша надзелены незвычайнымі здольнасцямі мастака. Яму падуладныя паэтычная, пяшчотная акварэль і выразны, кантрасны графічны штрых. Юны мастак піша і маслам.

Любімыя яго героі — людзі непахіснай волі. У абласным краязнаўчым музеі ўжо экспануюцца шэсць карцін Сашы Курчанкі. Усе яны прысвечаны Ул. І. Леніну. Вось Ільіч на трыбуне, вось ён схіліўся над сталом і аб нечым думае. Вось ён, хітравата прыжмурыўшыся, вядзе гутарку з англійскім пісьменнікам Гербертам Уэлсам...

Юны жывапісец працуе шмат і з захапленнем. Можа прайсці некалькі гадзін, пакуль на кавалку кардону або на палатне не ўзнікнуць правільныя абрысы таго, што жыве ўжо ў яго ўяўленні. Іменна так ствараліся карціны, якія апавядаюць пра перамогу савецкага чалавека ў космасе.

Добрыя палотны, якія малююць вобраз Тараса Шаўчэнкі. Некаторыя з іх («Дзіцячыя гады Тараса», «Уставайце, путы разарвіце») экспануюцца ў ленінградскіх музеях.

Але жыццё юнага мастака праходзіць не толькі ля мальберта. Ён шмат чытае, любіць музыку. І, вядома, вучыцца — у дзевятым класе 35-й Чарновіцкай школы. Вучыцца добра. Школа акружыла Сашу сардэчнай увагай, цёплым клопатам. Калі ў дзевятым класе ў час урокаў пачынаецца пераклічка і настаўнік называе прозвішча Курчанкі, клас дружна адказвае: «Ёсць!» Гэта значыць, што Саша заўсёды з імі, хоць ён і прыкуты да пасцелі. А пасля ўрокаў сябры вясёлым гуртам прыходзяць у яго пакой. Кватэру запаўняюць смех, песні, бясконцыя спрэчкі. І сярод дзіцячых галасоў ледзь не самы звонкі — голас Сашы.

Уладзімір ПАПОЎ
(АДН).

«Я БУДУ ЗМАГАЦЦА ЗА ЖЫЦЦЁ...»

КАРЦІНА ЮНАГА МАСТАКА

Яўгенія НЯЧАЕВА. «Свята». (З дыпломных работ выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

1000 ФОТА НАСТАЎНІКА-ТУРЫСТА

Мікалай Фёдаравіч Чыкуноў, настаўнік Дубровенскай сярэдняй школы № 1, вялікі аматар турызму. Штогод у час летніх канікул ён адпраўляецца ў паходы.

За апошнія гады настаўнік пабываў амаль ва ўсіх кутках Беларусі, многіх абласцях Украіны і Расійскай Федэрацыі.

Мікалай Фёдаравіч ніколі не расстаецца з фотаапаратам. Сярод 1000 фотаздымкаў яго альбома можна ўбачыць маляўнічыя мясціны Белавежскай пушчы, лясоў Дубровеншчыны. Ёсць здымкі з Нарачы, Гомельшчыны, Масквы, Ленінграда, Брэста, Кіева.

Здымкі «Непераможныя» і «На вышыні» экспанаваліся на ўсесаюзнай фотавыстаўцы «Сямігодка ў дзеянні».

Звыш 25 работ настаўніка аб жыцці Дубровеншчыны і Віцебшчыны будзе паказана на абласной фотавыстаўцы, прысвечанай 50-годдзю Савецкай улады.

І. КОГАН.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

30 жніўня

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — «Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Бурацінa на Камчатцы». Тэлевізійны фільм (М). 17.30 — «Сельская навіна». Уключэнне Мінска (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — спорт за тыдзень. 18.35 — «Свет сёння» (М). 19.00 — першынство СССР па футболу. «Дынамо» (Кіеў) — «Дынамо» (Мінск). Перадача з Кіева. 20.45 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — «У свеце танца». Тэлевізійны часопіс. 21.45 — па вашых просьбах. «Над Цісай». Мастацкі фільм. 23.15 — першынство Еўропы па лёгкай атлетыцы. Перадача з Будапешта (у запісе).

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — канцэрт украінскай песні. Перадача з Адэсы. 18.35 — для дзяцей. «Гаўрош». Мастацкі фільм. 19.50 — «З табою, Расія». Дакументальны фільм. 21.00 — Г. Лорка. «Мар'яна Пінеда». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 22.30 — гутаркі ля раяля. Ф. Ліст. Саната сі мінор (М).

31 жніўня

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Усё пачалося з балалайкі». Прэм'ера тэлевізійнага фільма (М). 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17.30 — «Мастак у рэвалюцыі». Тэлевізійны нарыс пра скульптара Г. Д. Аляксеева (М). 18.00 — для малышоў. «Сястрыца Алёнушка і браток Іванушка». Мультыплікацыйны фільм. 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Добрая падрыхтоўка — залог поспеху». Да новага навучальнага года ў сістэме партыйнай асветы. 19.00 — «Турнір дапытлівых». Каляндар-віктарына. 20.00 — аперэта Н. Мінха. «Кварталы Парыжа». Спектакль Свярдлоўскага тэатра музычнай камедыі. Перадача з Сочы. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 23.00 — першынство Еўропы па лёгкай атлетыцы. Перадача з Будапешта (у запісе).

Другая праграма. 18.00 — «Я іду закаханая». Канцэрт (М). 18.30 — «Панарама Радзімы» (М). 19.00 — у эфіры — «Маладосць» (М). 20.00 — «Сарока-зладзейка». Мастацкі фільм. 21.20 — рэклама, аб'явы. 21.30 — «Утаймаванне свавольніцы». Фільм-опера.

1 верасня

Першая праграма. 16.50 — праграма перадач. 17.00 — для малодшых школьнікаў. «Віншуем з пачаткам навучальнага года». Перадача з Ленінграда. 17.30 — для дзяцей. «Першакласнікі». Рэпартаж з мінскай сярэдняй школы № 24. 17.50 — «Бацькам пра дзяцей». Выступленне прэзідэнта Акадэміі педагагічных навук СССР І. А. Каірава (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Дзень добры, верасень!» Канцэрт для школьнікаў. 18.40 — рашэнні майскага Пленума ЦК КПСС — у жыццё. «Галоўны напрамак». Пра вопыт укаранення перадавой тэхнікі на тарфяніках. 19.05 — «Еўропа. Лета, 1966». Выступленне паэта Сяргея Грахоўскага. 19.40 — «Мой горад». «Уздоўж цэнтральнай магістралі». Пра мінулае, цяперашняе і будучае Савецкага раёна г. Мінска. Перадача прысвячаецца 900-годдзю Мінска 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.50 — «В'етнам змагаецца — В'етнам пераможа!» Перадача, прысвечаная 21-й гадавіне абвяшчэння Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. 21.15 — «Для вас, завочнікі». Выступленне намесніка міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі В. Ц. Петрыкава. 21.30 — «Педагагічная паэма». Мастацкі фільм. 23.15 — першынство Еўропы па лёгкай атлетыцы. Перадача з Будапешта (у запісе).

Другая праграма. 17.30 — для школьнікаў. «Першы і апошні клас». Перадача з Кіева. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Табе, юнацтва!» (М). 19.10 — праграма Нальчыкскай студыі тэлебачання. Да 25-годдзя ўтварэння Кабардзіна-Балкарскай АССР (М). 20.30 — «Чалавек з легенды». Дакументальны фільм. 21.10 — рэклама, аб'явы. 21.15 — «Выклікаем агонь на сябе». Тэлевізійны фільм. Першая серыя (М).

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Праверце, ці не заканчваецца ў вас у верасні падпіска на газету

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»?

Прадоўжыць тэрмін падпіскі на апошні квартал 1966 года лепш загадзя, не адкладваючы на апошнія тыдні верасня.

Падпіска прымаецца ўсімі ўстановамі «Саюздруку», сувязі, а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку па месцы работы або вучобы.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Г. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19.
Тэлефоны: прыёмная галоўнага рэдактара — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда».
АТ 13020